

ЯК ДАГЛЯДАЦЬ СКУРУ ЗІМОЙ **8**

ЗАВАБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ У МУЗЕЙ ПРОСТА **12**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЛЮТАГА 2020 г. СЕРАДА № 28 (29142)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў:**

*«Няма ніякай «уцечкі мазгоў» — ёсць міграцыя. «Уцечка мазгоў» азначае масавы адток спецыялістаў з канкрэтнай галіны з наступным выездам за межы краіны. У нас жа ёсць міграцыя, якая заўсёды была і заўсёды будзе. Ёсць тыя, хто з'язджае на работу па кантракце і вяртаецца назад пасля яго заканчэння. З'язджаюць на стажыроўкі, спецыялізацыі, на пастаяннае месца жыхарства. Нарэшце, бываюць, на шчасце, нячаста, спробы перакупіць нашых спецыялістаў. Але пры гэтым ёсць і пэўная колькасць урачоў, якія з-за мяжы прыязджаюць на работу да нас. То-бок гэта нармальны працэс міграцыі».*

з першых вуснаў

# «НАШЫ НАВІНЫ, НАША СУМЛЕННАЯ ПАЗІЦЫЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАНЕСЕНЫЯ ДА КОЖНАГА І ПАЧУТЫЯ ЎСІМІ»

### Прэзідэнт правёў нараду з кіраўнікамі вядучых дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі



Фота БелТА.

Распачынаючы сустрэчу, Прэзідэнт выказаў гатоўнасць адказаць на любыя пытанні рэдактараў. А неабходнасць прадметнай размовы ўжо наспела: каля двух гадоў прайшло з таго часу, як у вядучых беларускіх СМІ змяніліся кіраўнікі. На думку Прэзідэнта, надышоў момант абмеркаваць выкананне даручэнняў, дадзеных у тым ліку і пры прызначэнні, пачуць бачанне стратэгіі далейшай работы, актуалізаваць задачы, якія стаяць перад сродкамі масавай інфармацыі.

Задачы, прызнае беларускі лідар, няпростыя ў няпросты час. Цяперашняе становішча абсалютна не схіляе кіраўніка дзяржавы да нейкай заспакоенасці. Супрацьстаянне, геапалітычная нестабільнасць у розных частках свету, у тым ліку ў нашым рэгіёне, — усё гэта на парадку сённяшняга дня.

«Важным складнікам незалежнасці любой дзяржавы з'яўляецца інфармацыйны суверэнітэт. Гэта права праводзіць уласную інфармацыйную палітыку ў сваёй дзяржаве, фарміраваць нацыянальную інфармацыйную інфраструктуру, забяспечваць інфармацыйную бяспеку. Што да замежжа, то абсалютна сумленнае, добрае інфармаванне тых, хто цікавіцца Беларуссю, і нават тых, хто сёння, можа быць, і не цікавіцца Беларуссю. Інфармаваць пра тыя падзеі, тыя рэчы, якія адбываюцца ў нашай краіне. ***І гэта права мы як суверэнная і незалежная дзяржава, на жаль, сёння мусім адстойваць у што б там ні стала, у тым ліку і на інфармацыйным полі***», — абазначыў пазіцыю Аляксандр Лукашэнка.

**ЗБРОЯ МАСАВАГА ПАРАЖЭННЯ**

Крыху менш за год таму ў нашай краіне распрацавана і прынята Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Беларусі — менавіта для супрацьстаяння новым рызыкам, выклікам і пагрозам. Гэта першы сур'ёзны крок у выпрацоўцы стратэгіі інфармацыйнай бяспекі, але ён таксама можа патрабаваць удасканаленняў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: даўно адышлі ў нябыт часы, калі прэса была толькі сродкам данясення інфармацыі.

***«Сёння гэта паўнавартасная зброя, прычым, як я ўжо раней казаў, масавага паражэння.*** Падтасаваныя факты, фэйкі і дыпфэйкі, так званая постпраўда, калі аўдыторыяй умела маніпулююць, наўмысна адводзячы ад сапраўды важных праблем. Гэтая і іншая інфармацыйная атрута падобна да хімічнай зброі. Ці тое яшчэ будзе... Нас чакаюць яшчэ больш складаныя рэчы, якія цяжка будзе абвяргаць — прынамсі, у кароткі тэрмін. Гэтая няпраўда, гэтая ***хлусня выкошвае цэлыя пласты ўспрымальнага насельніцтва, робячы іх безабароннымі перад сваім разбуральным уздзеяннем.*** Таму інфармацыйнае проціборства цяпер адыгрывае асаблівую ролю», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**СТАР. 2**

## КОРАТКА

- **Найлепшы ляснічы 2019 года Аляксандр Гайса працуе ў Астравецкім лягсасе.**



- Вакцыну супраць новага каранавіруса пачалі тэсціраваць у Кітаі.
- **Амаль траціна донарскай крыві ў Беларусі здаецца бязвыплатна.**
- Гатоўнасць другога энергаблока БелАЭС ацэньваецца ў 70 %.
- **Беларускія кандытары возьмуць удзел у Сусветнай кулінарнай алімпіядзе.**
- У студзені больш за ўсё падаражэлі агуркі, вінаград і памідоры, патаннела проса.

ISSN 1990 - 763X

20028

9 771990 763008

# ПРАЦЯГНУЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

Жыццё ў бяспецы





**З пачатку года Беларусь адправіла два самалёты з гуманітарнай дапамогай у Кітай, дзе разгарэлася эпідэмія з-за новага каранавіруса. У камплектаванні і пагрузцы каштоўнага грузу ўдзельнічалі нашы ратавальнікі. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях ад самага свайго стварэння актыўна развівае кіраўнік міжнароднага супрацоўніцтва. Але як жа ўсё адбываецца? Аб гэтым «Звяздзе» расказаў кіраўнік аддзела кіраўніцтва міжнароднага ўпраўлення ведамства Дзмітрый ТКАЧУК.**

**СТАР. 4**

Камунальныя стасункі

# ЦЯПЛО Ў ХАТУ ЗА МЕНШУЮ АПЛАТУ

### Навошта патрэбна цеплавая мадэрнізацыя і чаму нельга ўпускаць шанц заплаціць за гэта менш

**Ці ведалі вы, што амаль палова цяпла ў старых шматкватэрных жылых дамах выходзіць праз няўцепленыя сцены? А колькі такі будынак страчвае праз дах, вокны і вентыляцыйныя шахты? Калі аплачваеш толькі 20 % рэальнага кошту цяпла, мала задумваешся, колькі грошай вылятае праз фортку, якую адчыняеш, калі ў кватэры вельмі горача. Але ж некалі мы прыйдзем да таго, што будзем плаціць за цяпло па яго сабекошце, дык чаму б не паклапаціцца загадзя пра эканомію сваіх сродкаў?**

**СТАР. 7**



# «НАШЫ НАВІНЫ, НАША СУМЛЕННАЯ ПАЗІЦЫЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАНЕСЕНЫЯ ДА КОЖНАГА І ПАЧУТЫЯ ЎСІМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт добра разумее, якая жорсткая сёння канкурэнцыя на інфармацыйным полі. Беларусь з усіх бакоў працятая рознымі медыйнымі патокамі, многія з якіх адкрыта дэструктыўныя.

Больш за тое, на нядаўняй сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у Сочы Аляксандр Лукашэнка ў тым ліку абмяркоўваў публікацыі на беларускую тэматыку ў шэрагу расійскіх СМІ і Telegram-каналаў.

«І не трэба нас параўноўваць з такімі дзяржавамі, здаецца, як мы, — Швейцарыяй, Аўстрыяй і гэтак далей, — бо гэтыя дзяржавы існуюць у складзе магутнага, велізарнага Еўрапейскага саюза і заўсёды абапіраюцца на сваіх саюзнікаў. Прынамсі, у спіну ім не страляюць. ***Мы ж знаходзімся ў такім становішчы, што нам і ад саюзнікаў дастаецца, і ад сапернікаў*** (ці ворагаў, як мы называлі). І ў гэтым плане Беларусь прастрэльваецца з усіх бакоў», — расставіў кропкі над «і» лідар краіны.

У буйных замежных СМІ ў адносінах да нашай краіны часта з'яўляюцца інсінуацыі, а часам і зусім яўныя хлусня і паклёп. У такіх няпростых умовах, лічыць Аляксандр Лукашэнка, ***надзвычай важна ўзяць і ўтрымаць увагу, але пры гэтым не страціць давер гледачоў, чытачоў і слухачоў.*** Неабходна сумленна і аб'ектыўна гаварыць з аўдыторыяй на зразумелай мове.

«У нас гэтага крыху не хапае. ***Адрозненне нашых сродкаў масавай інфармацыі — ашаламляльнае адрозненне на нашу карысць — у тым, што мы нашмат больш сумленныя.*** Беларускія СМІ абсалютна праўдзіва выкладаюць тую ці іншую тэму альбо інфармацыю», — ацаніў Прэзідэнт.



Фота БелТА.

## БОЛЬШ АНАЛІТЫКІ

Не сакрэт, што кіраўнік дзяржавы асабіста ўважліва сочыць за беларускай медыйнай прадукцыяй. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што інтэрнэт не здолее перацягнуць абсалютную большасць аўдыторыі ў анлайн.

«Канешне, апошнім часам інтэрнэт усё больш і больш заваёўвае сваю прастору. Няхай гэта будзе на дадзеным этапе як дадатак да традыцыйных СМІ. Можа, яны ўжо дзесьці ўпоравень выйшлі, крыху наперад па некаторых кірунках, але традыцыйныя сродкі масавай інфармацыі будуць заўсёды. ***На навінку заўсёды кідаюцца, асабліва моладзь. Пройдзе час, усё гэта схлыне, застанецца на сур'ёзным узроўні***», — мяркуе кіраўнік краіны.

Па яго словах, таленавіты журналіст можа і павінен быць лідарам грамадскай думкі. ***Сёння аблічча любога СМІ павінна вызначаць аўтарская журналістыка.*** А сродкам масавай інфармацыі неабходныя новыя асобы, цікавыя персаналіі, цікавыя тэмы. Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што часта ў эфіры не хапае вастрыні і апэратыўнасці.

Таму ад тэлебачання Аляксандр Лукашэнка чакае адыходу ад замежных платформаў, бо далёка не ўсё, што там ёсць, добрай якасці, а Беларусі трэба больш уласнай тэлепрадукцыі. Друкаваным СМІ, каб утрымацца на плаве ў сучасным лічбавым свеце, Прэзідэнт параіў актыўна займацца аналітыкай.

«Канешне, мы заўсёды былі і будзем аб'ектыўныя. ***Але нашы навіны, наша сумленная пазіцыя павінны быць данесеныя да кожнага і пачутыя ўсімі. Нам увогуле саромецца няма чаго*** (а ў нас часам гэта бывае). Мы працуем на сваю краіну і свой народ. Дзякаваць богу, мы ўжо адышлі ад таго, што было ў сярэдзіне 90-х, пасля распаду Савецкага Саюза, калі журналісты ўсе былі «нашы», «не нашы». Вы ўжо на роўных з імі канкуруеце, у вас ужо камяні так не кінуць», — звярнуўся да кіраўнікоў СМІ Аляксандр Лукашэнка.

### Дарэчы

Згодна з інфармацыяй прэс-службы Прэзідэнта, на пачатак года ў нашай краіне зарэгістравана 1614 друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, 9 інфармагенцтваў, 20 сеткавых выданняў, 270 тэлерадыёвяшчальных СМІ. Акрамя таго, на тэрыторыі краіны распаўсюджваецца больш за 270 замежных тэлепраграм і каля трох тысяч замежных друкаваных СМІ.

### У тэму

Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр Карлюкевіч паведаміў журналістам, што пастаўленыя Прэзідэнтам на нарадзе (яна, між іншым, доўжылася больш за тры гадзіны) канкрэтныя задачы ў большай ступені датычыліся якасці медыяпрадукту. У прыватнасці, у Беларусі плануецца стварэнне айчыннага медыявымяральніка, які мае пачаць працаваць ужо сёлета і будзе вырашаць задачы для ўсяго рынку тэлевізійнай рэкламы, і навіннага тэлевізійнага канала.

«Безумоўна, ішла гутарка аб тым, што сённяшні парадак дня на старонках газет, электронных сродкаў масавай інфармацыі мусіць адпавядаць задачам, якія краіна будзе вырашаць сёлета», — дадаў міністр.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# «Кітайцы павінны ведаць, што беларусы — стойкія і надзейныя людзі і сапраўдныя сябры»

Якія задачы Прэзідэнт паставіў перад новым паслом у Кітаі

**Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што з дыпламатычнай місіяй пасол едзе ў няпросты перыяд. «І справа не толькі ў тым, што вірус там, — свет перажывае і больш складаныя абставіны. Справа ў тым, што ў сувязі з гэтым каранавірусам пачынаюцца розныя ўкіды ў медыйную прастору, фэйкавыя навіны і гэтак далей. Кітайцы павінны ведаць, што беларусы — стойкія і надзейныя людзі і сапраўдныя сябры», — падкрэсліў кіраўнік краіны.**

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што кітайскі бок добра ўспрыняў прызначэнне Мікалая Снапкова паслом.

«Прэзідэнт даручыў на месцы комплексна, зыходзячы з бягучых умоў, абмеркаваняў з кітайскімі партнёрамі, разгледзець кірункі, канкрэтыку і самае галоўнае — тое, як рэалізаваць рост эканамічнага патэнцыялу супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Мэта — эканамічны рост нашай краіны», — расказаў Мікалай Снапкоў журналістам пасля сустрэчы з кіраўніком дзяржавы.

На першым месцы сярод задач беларускага пасольства ў КНР — экспарт беларускай прадукцыі і разумны імпарт, асабліва датычна прамежкавых тавараў.

«Прамежкавыя тавары даюць нам істотную эканомію ў адносінах да аналагічных тавараў такой жа якасці, якія пастаўляюцца з Расійскай Федэрацыі і Еўрапейскага саюза, — растлумачыў Мікалай Снапкоў. — Такая эканомія, па разліках Міністэрства эканомікі, у год складае 400 мільёнаў долараў. Як вы разумееце, гэта ўплывае на рост дабаўленага кошту і, адпаведна, рост ВУП. Размова пра тое, што трэба пісьменна працаваць з камплектуючымі, якія пастаўляюцца на нашы прадпрыемствы».

Вяртаючыся да базавага патрабавання кіраўніка дзяржавы — нарошчвання беларускага экспарту ў Кітай, пасол адзначыў, што Беларусь — экспартаарыентаваная краіна, а Кітай — невычарпальны рынак, які расце.

«Мы маем і гандлёвыя бар'еры, і мытныя бар'еры, і недастатковы ўзровень вытворчасці для пастаўкі запатрабаваных кітайскім рынкам тавараў. Усё гэта трэба яшчэ раз прааналізаваць у практыкапрымяняльным характары і далажыць Прэзідэнту з выхадам на адпаведныя яго даручэнні канкрэтным асобам», — дадаў ён.

Мікалай Снапкоў не стаў называць канкрэтную дату свайго ад'езду, але сказаў, што гэта адбудзецца хутка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Фіяна фойл» перамагла на парламенцкіх выбарах у Ірландыі




Вынікі падліку галасоў датэрміновых выбараў паведаміў нацыянальны тэлеканал RTE. Апазіцыйная партыя «Фіяна фойл» атрымала 38 са 160 дэпутацкіх мандатаў, нацыянал-рэспубліканская партыя «Шын фейн» — 37. Для апошняй гэта самая вялікая колькасць крэслаў у сваёй гісторыі. Аналітыкі кажуць аб «палітычным землятрусе», кіраўніцтва партыі называе зыход датэрміновых выбараў «рэвалюцыяй». Кіруючая цяпер кансерватыўная партыя «Фінэ гэл» мае ў актыве 35 мандатаў, саступіўшы сваім галоўным сапернікам. Партыі «зялёных» дасталіся 12 месцаў у парламенце, лейбарысты і сацыял-дэмакраты атрымалі па шэсць мандатаў. Першае пасяджэнне парламента новага склікання адбудзецца 20 лютага, удакладніў RTE. Для фарміравання большасці трэба не менш за 80 мандатаў. Пры гэтым аналітыкі не бачаць магчымасці саюза для любых дзвюх партый з ліку лідараў. У любым выпадку перагаворы могуць працягвацца некалькі тыдняў. Палітолагі асцярожна спадзяюцца, што пагадненне будзе дасягнута хоць бы да нацыянальнага свята, Дня святога Патрыка, 17 сакавіка.

### Філіпіны спыняюць дзеянне ваеннай дамовы з ЗША



Міністэрства замежных спраў Філіпін апавясціла ЗША аб скасаванні дамовы аб замежных узброеных сілах. Пра гэта на сваёй старонцы ў «Твітэры» паведаміў намеснік міністра замежных спраў Дадо Дзюлай. Як адзначае выданне Manila Bulletin, пагадненне спыніць сваё дзеянне праз 180 дзён з моманту атрымання Вашынгтонам дадзенага ліста. Дамова аб статусе замежных узброеных сіл (Visiting Forces Agreement) была падпісана ў 1998 годзе і рэгулюе правілы ўезду і знаходжання амерыканскіх вайскоўцаў на Філіпінах, падаючы таксама юрыдычную аснову для правядзення сумесных вучэнняў на тэрыторыі краіны. Аб рашэнні спыніць дзеянне пагаднення прэзідэнт Радрыга Дутэртэ абвясціў у студзені, пасля адмовы Вашынгтона выдаць візу філіпінскаму сенатару Ранальду дэла Росэ. Такі крок разглядаецца прэзідэнтам як умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Манілы.

### У Расіі пералічаць белых мядзведзяў

Аб гэтым паведаміла прэс-служба Мінпрыроды РФ. «Такім чынам, упершыню ў гісторыі будуць атрыманы самыя поўныя дадзеныя аб стане папуляцыі белага мядзведзя на тэрыторыі нашай краіны», — растлумачылі ў Мінпрыроды. Плануецца, што ў 2021 годзе навукоўцы правядуць авіяўлік белых мядзведзяў у Чукоцкім і Усходне-Сібірскім морах, у 2022-м — у моры Лапцевых і Карскім моры, а ў 2023-м — ва ўсходняй частцы Баранцавага мора і акваторыі Зямлі Франца Іосіфа. Фінансаваць праект мае намер «Раснафта». Увесь 2020 год будзе прысвечаны падрыхтоўцы да маштабных даследаванняў. Плануецца распрацаваць, зацвердзіць і ўзгадніць дэталёвы план адпаведных работ, правесці трэнінг для ўдзельнікаў праекта, закупіць абсталяванне, а таксама распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па падліку. У міністэрстве нагадалі, што ўсе тры папуляцыі белага мядзведзя, якія знаходзяцца ў Расіі, занесены ў Чырвоную кнігу.



Да ведама

# Тэрмін службы залічаць у страхавы стаж

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10 лютага падпісаў Указ № 48 «Аб павышэнні ўзроўню сацыяльнай абароны грамадзян у сувязі з прызывам на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве». Пра гэта паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Такім чынам, з 1 студзеня салдаты, якія знаходзяцца на тэрміновай ваеннай службе або служаць у рэзерве, падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню на выпадак пенсійнага ўзросту, інваліднасці або страты карміцеля. Дакумент рэгламентуе парадак выплаты абавязковых узносаў за перыяды ваеннай службы. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць залічваць такія перыяды ў страхавы стаж, які і вызначае права на працоўную пенсію.

Акрамя таго, для тых, хто ўжо адслужыў, таксама прадугледжаны шэраг ільгот. Датычацца яны падрыхтоўкі да паступлення ў навучальныя ўстановы. У год звальнення або ў наступны год пасля гэтага можна будзе вучыцца на падрыхтоўчых факультэтах, аддзяленнях і курсах у дзяржаўных установах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі за бюджэтны кошт. Але для гэтага трэба мець сярэдні паказчык у дакуменце аб адукацыі не ніжэй за шэсць балаў і рэкамендацыю з воінскай часці. Таксама тыя, хто адслужыў, атрымаюць пераважнае права выбару месца работы па спецыяльнасці падчас размеркавання.

Цяпер члены сям'і вайскоўца яшчэ змогуць карыстацца жылым памяшканнем дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнатах на ўвесь перыяд яго тэрміновай службы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Блізкая ўлада

# Пачуць і дапамагчы

**Больш за дваццаць чалавек выслухаў падчас выязнога прыёму ў Маладзечне памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ.**

Як заўсёды не абышлося без жыллёвых пытанняў. Алена Васілеўна жыве ў арэнднай кватэры, у жніўні мінулага года яна напісала заяву аб выдзяленні сацыяльнага жылля. Аднак ёй адмовілі. Прычына — яе штомесячны сукупны даход перавышае пражытковы мінімум. Акрамя таго, жанчына прасіла паменшыць ёй арэндную плату, якая складае 180 рублёў у месяц. У яе невялікая пенсія, дзеці таксама дапамагчы не могуць. Алена Васілеўна не супраць працаваць, каб мець хоць і невялікую прыбаўку да пенсіі, але яе не бяруць на работу, паколькі ёй 67 гадоў. Ігар Яўсееў даручыў прадстаўнікам мясцовай улады разгледзець і прапанаваць жанчыне варыянты працаўладкавання.

А начальнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей Бохан прапанаваў пенсіянерцы пакой у інтэрнаце, за які давядзецца плаціць усяго 15—20 рублёў. Тым больш што выбар ёсць. Як адзначыў старшыня райвыканкама Юрый Горлаў, у горадзе налічваецца звыш 50 інтэрнатаў. Маладая маці Таццяна пражывае ў інтэрнаце, выхоўвае малое дзіця. Дзяўчына — сірата, стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў з 18 гадоў. Таццяне прапануюць арэнднае або сацыяльнае жыллё. Пытанне ўзялі на кантроль.

Жыхары вуліц Меліярацыйная і Гідратэхнікаў заклапочаны пытаннямі водаадвядзення. Для ўладкавання каналізацыі неабходна 250 тысяч рублёў. На гэтых вуліцах жывуць у асноўным пенсіянеры, а такая сума для іх непад'ёмная. Памочнік Прэзідэнта паабяцаў разабрацца ў сітуацыі і даручыў райвыканкаму сабраць інфармацыю аб пражываючых там пенсіянерах, каб паглядзець, чым ім можна дапамагчы.

Канстанцін Козел з вёскі Краснае прыйшоў на прыём ад імя землякоў, якія жывуць на вуліцы 1 Мая. Рака Уша, што працякае побач, часта разліваецца, падтапліваe падвалы, калодзежы. Мужчына асцерагаецца, што пітная вада забруджваецца. Мінулай вясной узровень жалеза быў у дзесяць разоў больш допушчальнай нормы. Аднак, згодна з аналізамі водаканала, ніякага перавышэння не зафіксавана. Ды заяўнік не давярае спецыялістам. Выхад з сітуацыі — пракладка водаправода, але побач праходзіць аўтамагістраль, што ўскладняе правядзенне работ. **Ігар Яўсееў даручыў разгледзець магчымасць устаноўкі калонак, якія часова дапамогуць зняць праблему.**

Частка пытанняў датычылася зямельных адносін. У прыватнасці, Анастасія Яўгенаўна прасіла дапамагчы ў афармленні ўчастка для вядзення фермерскай гаспадаркі. Як паведаміла начальнік аддзела землеўпарадкавання Марына Чарняк, працэдура па выдзяленні зямлі прыпынена, паколькі выяўлена самавольнае збудаванне. Зямлю могуць прадаставіць толькі пасля зносу пабудовы, закон адзін для ўсіх, рэзюмаваў Ігар Яўсееў.

— Кіраўнік дзяржавы вызначыў 11 гарадоў як паказальныя. У ліку іх і Маладзечна. Мы пастараемся стварыць тут самыя камфортныя ўмовы для працы, адпачынку, жыцця людзей. Няхай нейкія пытанні не зможам вырашыць адразу, але чалавеку параім, падкажам, растлумачым, што рабіць далей, — адзначыў напрыканцы прыёму Ігар Яўсееў.

А пасля памочнік Прэзідэнта пабываў у філіяле «Мінаблтранса» — аўтобусным парку № 4. Раней там узнікалі вытворчыя праблемы, цяпер абнаўляецца рухомы састаў. Ігар Яўсееў пагутарыў з калектывам, кіраўніцтвам прадпрыемства, пацікавіўся, як ідуць справы, на сваe вочы пабачыў сітуацыю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Ва ўрадзе

# ЗАРОБКІ Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

## Падтрыманне ўзроўню рэальных заробкаў — задача нумар адзін для ўрада ў гэтым годзе

**Савет Міністраў правёў пасяджэнне па выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця. У першым квартале арганізацыі, у якіх не забяспечваўся належны ўзровень заработнай платы, павінны выйсці на 500 беларускіх рублёў. Персанальная адказнасць за гэта, як адзначыў прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС, на мясцовых кіраўніках. Але галоўная ўмова застаецца непахіснай — заробкі павінны быць напрацаваны.**

Асобную ўвагу на пасяджэнні надалі выканальніцкай дысцыпліне. Асабліва тут адстаюць Мінжылкамгас, Мінскі і Гомельскі гарвыканкамы.

«Мы прааналізавалі, як выкананы даручэнні прэм'ер-міністра, рашэнні Савета Міністраў і яго Прэзідыума, па якіх патрабаваўся даклад ураду. Выснова: амаль пятая частка даручэнняў выканана з парушэннем устаноўленых тэрмінаў», — перадае словы прэм'ер-міністра БелТА.

Задачы кіраўнік урада паставіў і перад IT-сектарам. Галіна павінна быць больш арыентавана на беларускую, а не замежную эканоміку. Дарэчы, сувязь і інфармацыя — сферы, якія зрабілі значны ўнёсак у рост эканомікі краіны ў 2019 годзе. І такая сітуацыя характэрна не толькі для Міншчыны, дзе размешчаны Парк высокіх тэхналогій. Ён стаў значным суб'ектам, які забяспечвае паступленне валюты ў краіну. «Гэта добра, але IT-сектар павінен больш працаваць на беларускую эканоміку. Пакуль жа ўзровень узаемадзеяння ўнутры краіны па гэтым кірунку цяжка назваць дастатковым — усе найноўшыя распрацоўкі працуюць на эканоміку іншых краін», — сказаў кіраўнік урада.

Звярнуў увагу Сяргей Румас і на зніжэнне ўзроўню работы з інвестарамі на месцах. Паказчыкі па прыцягненні прамых замежных інвестыцый не выканалі чатыры рэгіёны: Брэсцкі, Віцебскі, Гродзенскі і Мінскі.

На слыху

# Кодэкс для педагога: непрадузятасць, карэктнасць і павага

**Прыкладныя этычныя правілы педагагічных работнікаў апублікаваны на сайце Міністэрства адукацыі. Абмяркоўваць праект дакумента спецыялісты і педагогі будуць да 1 сакавіка.**

З'яўленне своеасаблівага «Этычнага кодэкса» настаўнікаў анансаваў на мінулым тыдні міністр адукацыі Ігар Карпенка. Мяркуецца, што падобны збор правілаў дапаможа ў прадухіленні канфліктных сітуацый, якія пачасціліся ва ўстановах адукацыі апошнім часам.

Аснову кодэкса складуць прынцыпы педагагічнай этыкі: ненасілля, аўтаноміі, талерантнасці, адказнасці, справядлівасці, павагі да правоў і годнасці іншага чалавека, кампетэнтнасці, прыстойнасці.

Ад педагагічнага работніка пры ажыццяўленні прафесійнай дзейнасці патрабуецца ствараць і падтрымліваць паважлівыя і даверныя адносіны ў педагагічным калектыве і калектыве навучэнцаў, не дапускаць ацэнак і выказванняў, што прыніжаюць гонар і годнасць калег, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

Патрабуецца таксама пазбягаць сітуацый, здольных нанесці шкоду дзелавой рэпутацыі педагагічнага работніка або ўстановы адукацыі. Праблемы педагагічнай сферы павінны абмяркоўвацца ў паважлівай форме, а рашэнні — прымацца ў адкрытых педагагічных дыскусіях. Педагог павінен спакойна ўспрымаць крытыку, умець прызнаваць свае памылкі, пазбягаць канфліктаў ва ўзаемаадносінах, імкнуцца да карэктнага вырашэння спрэчных пытанняў як у прыватным, так і ў грамадскім жыцці.

Не дапускаюцца абмеркаванне рабочых момантаў, публічнае перадузятае абмеркаванне ўстановы адукацыі, у тым ліку ў інтэрнэце.

Забараняецца злоўжываць службовым становішчам, патрабаваць ад навучэнцаў (законных іх прадстаўнікоў) якіх-небудзь паслуг, узнагароды за сваю працу (дадатковую ў тым ліку).

Ад настаўнікаў патрабуецца праяўляць павагу да сямейных, культурных і канфесійных традыцый навучэнцаў. Неабходна прытрымлівацца этычных нормаў у медыяпрасторы, не дапускаць размяшчэння ў сеціве інфармацыі, якая можа нанесці шкоду здароўю або развіццю дзіцяці. Педагог не можа паведамляць іншым асобам інфармацыю, даверaную яму асабіста вучнем. Нельга дапускаць выпадкі прымянення метадаў фізічнага, маральнага і псіхічнага гвалту ў дачыненні да навучэнцаў.

Пры ацэнцы вучэбных дасягненняў настаўніку трэба быць аб'ектыўным і справядлівым, не дапускаць тэндэнцыйнага заніжэння або завышэння ацэначных балаў, не ставіць пад публічную крытыку асобы навучэнца і яго законных прадстаўнікоў.

Педагогі абавязаны добрасумленна і якасна выконваць свае прафесійныя абавязкі, клапаціцца пра прэстыж прафесіі, паважаць гонар і годнасць калег, не дапускаць дзеянняў, якія наносяць шкоду аўтарытэту педагагічных работнікаў.

Знешнім выглядам, характарам і паводзінамі, культурай зносін педагог павінен адпавядаць традыцыям і нормам прафесійнай супольнасці, падтрымліваць прафесійны гонар педагагічнага работніка, яго місію, абараняць свой аўтарытэт, аўтарытэт сваіх калег, не абмяркоўваць з навучэнцамі і іх законнымі прадстаўнікамі недахопы калег. Не пераносіць свае асабістыя сімпатыі і антыпатыі на службовыя адносіны.

Асобны пункт забаранне «нетактоўнае ўмяшанне» ў асабістае жыццё, праявы зайздрасці, нядобразычлівасці, прымяншэння заслуг іншых педагагічных работнікаў.

У праекце прапісана, што педагог павінен прытрымлівацца такога спосабу жыцця, які не наносіць шкоду прэстыжу прафесіі і адносінам з навучэнцамі і не перашкаджае якаснаму выкананню прафесійных абавязкаў. Таксама ў праекце правіл замацаваны дзелавы стыль адзення для педагогаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Будзьце пільныя!

# РАЗДОЛЛЕ ДЛЯ ФІШАРАЎ

## Распрацоўшчыкі антывірусаў нагадваюць аб пастках для кашалькоў карыстальнікаў

**Напярэдзе новая хваля свят, а значыць, ёсць імавернасць, што «прасунутыя» зладзеі зноў узмоцняць сваю актыўнасць. «Лабараторыя Касперскага» рэкамендуе быць асабліва пільнымі ў гэты час. Прааналізаваўшы актыўнасць зламыснікаў у пераднавагодні перыяд мінулага года, эксперты кампаніі высветлілі, што доля фінансавага фішынгу ў гэты час па ўсім свеце вырасла на 9,5 % і склала амаль 53 % ад усіх спроб злачынных нападаў.**

Так, за некалькі дзён да «Чорнай пятніцы» колькасць заблакіраваных спроб пераходу на падробленыя копіі eBay вырасла ў чатыры разы і перавысіла восем тысяч штодня. Такі ўзровень трымаўся да сярэдзіны снежня. Амаль кожнае пятае фішынгавае паведамленне ў чацвёртым квартале было скамерскае, гэта значыць уяўляла сабой ашуканскую аб'яву, якая абяцала карыстальніку лёгкія грошы, напрыклад, за ўдзел у акцыі або праходжанне апытання. Як звычайна ў такіх выпадках, наведвальнікам прапаноўвалася выканаць нескладанае заданне, у тым ліку звязанае з увядзеннем асабістых звестак, і аплаціць невялікую камісію за пераклад сродкаў. Ашуканцы зарабляюць менавіта на гэтай «камісіі»: атрымаўшы яе, яны спыняюць зносіны з ахвярай скаму.




«Перад вялікімі святамі людзі часцей схільныя да здзяйснення імпульсіўных куплі. Зламыснікі заўсёды актывізуюцца ў гэты час, бо ў мітусні карыстальнікі часцей прымаюць за чыстую манету прапановы купіць нешта добрае па фантастычна нізкай цане. Вядома, гэта не значыць, што трэба цалкам адмаўляцца ад шопінгу, але мы рэкамендуем карыстальнікам заўсёды заставацца вельмі ўважлівымі пры правядзенні анлайн-аплат», — каментуе **Таццяна СІДОРЫНА, старшы кантэнт-аналітык «Лабараторыі Касперскага».**

Каб не стаць ахвярай фішараў, лабараторыя рэкамендуе карыстальнікам:

- здзяйсняць анлайн-куплі толькі ў афіцыйных крамах;
- уважліва правяраць, ці карэктна напісана назва анлайн-крамы ў адрасным радку: калі яна адрозніваецца ад арыгінала хоць на адзін знак, не варта там нічога купляць;
- не выкарыстоўваць адзін і той жа пароль для некалькіх сэрвісаў, таму што калі ён будзе скрадзены, будуць скампраметаваныя ўсе акаўнты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПРАЦЯГНУЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ



## Ад Эквадора да Непала

— Гуманітарнае супрацоўніцтва можна назваць нашым прыярытэтным кірункам, — адзначыў Дзмітрый Ткачук. — Ён фарміруе прэстыж і рэпутацыю краіны, якая імкнецца скарыстаць усе магчымасці, каб аказаць дапамогу дзяржавам, якія апынуліся ў бядзе. Гэта спрыяе развіццю стасункаў і па іншых кірунках.

Натуральна, толькі Паднябесная наша дапамога не абмяжоўваецца. За апошнія некалькі гадоў каштоўныя грузы накіроўвалі ў Венесуэлу, Украіну, Лівію, Турцыю, Непал, Сірыю, Эквадор, Мазамбік, Зімбабвэ, В'етнам. Апошнюю краіну вельмі моцна «патрапаў» у 2018 годзе магутны тайфун. Але сказаць, што ўвесь час адпраўляюцца адны і тыя ж грузы, нельга. Хоць часцей за ўсё ўсе нагоды можна падвесці пад адзін знаменальнік — масавае разбурэнне жылых дамоў і інфраструктуры. Прымаючы бок сам вырашае, што яму патрэбна, ствараючы канкрэтны рэестр. Гэта неабходна і для таго, каб не адбылося так, што па адных пазіцыях будзе збыткоўнасць, а па другіх — наадварот, дэфіцыт ці ўвогуле адсутнасць.

Часам дзейнічаюць за мяжой і нашы ратавальнікі. Напрыклад, у 2011 годзе яны дапамагалі тушыць лясныя пажары ў Разанскай вобласці Расіі. Праз тры гады быў камандзіраваны атрад у Сербію, паколькі на гэтую балканскую краіну абрынуліся моцныя залевы, якія выклікалі паводку. Штогод нашы верталёты адпраўляюцца ў Турцыю і Грэцыю для ліквідацыі лясных пажараў. Прычым адбываецца гэта па выніках адмысловага міжнароднага тэндару. А гэта значыць, што нам давяраюць.

## Вучымся самі і вучым іншых

***— У сярэдзіне дзесяцігоддзя да нас не раз заходзілі лясныя пажары з тэрыторыі Украіны. І нашы пажарныя таксама дапамагалі ўкраінцам тушыць узгаранні ў памежнай зоне...***

— Менавіта таму ўжо вельмі даўно былі заключаны дамовы аб супрацоўніцтве ратавальных службаў з усімі краінамі, з якімі мяжуе Беларусь. Толькі гэтым мы не абмяжоўваемся. Агулам колькасць такіх пагадненняў ужо пераваліла за 50. З кімсьці мы супрацоўнічаем па лініі падрыхтоўкі ратавальнікаў, з кімсьці — па сумесных праектах.

***— Чаму ж вучаць нас і чаму вучымся мы?***

— Нашы супрацоўнікі адпраўляюцца на вучэбныя курсы за мяжу ў тым выпадку, калі трэба пераняць новы досвед, але ў сілу розных прычын арганізоўваць падобныя курсы ў Беларусі не зусім мэтазгодна. Прычына можа быць, напрыклад, у






малой колькасці слухачоў, калі вузкія спецыялісты састраўды на вагу золата. Яшчэ адзін фактар — прыродная асаблівасць нашай краіны. У нас жа няма гор. А як вучыцца працаваць у баявых умовах тым жа ратавальнікам-альпіністам? Ці вось не так даўно ў Кыргызстане праводзіліся пад эгідай Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай абароны вучэнні сярод вадалазаў. Ва Узбекістане былі міжнародныя трэніроўкі па працы ў горнай мясцовасці... Таксама мы вывучаем асаблівасці сучаснай грамадзянскай абароны насельніцтва, як гэта робіцца, напрыклад, у Еўрасаюзе.

Аднак, з іншага боку, і мы прымаем у сябе на базе Міжнароднага цэнтра падрыхтоўкі ратавальнікаў з іншых краін. Цэнтр функцыянуе на базе нашага філіяла Універсітэта грамадзянскай абароны ў Светлым Гаі непадалёк ад Барысава. Там ужо вучыліся прадстаўнікі больш чым з 50 краін. Сярод іх — Казахстан, Расія, Латвія, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Малдова, Іарданія. І мы прапаноўваем нашым калегам добры патэнцыял у галіне выратавальных прац. А гэта ўсё — экспарт адукацыйных паслуг.

З кожнай краінай вядзецца супрацоўніцтва, якое цікавае абодвум бакам. Напрыклад, з Японіяй у нас даўнія стасункі на глебе радыялогіі. Калісьці прадстаўнікі Краіны ўзыходзячага сонца дапамаглі нам падчас ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Ёсць і цяпер шэраг праектаў, па якіх яны нам дапамагаюць. А калі ў 2011 годзе ў самой Японіі адбылася надзвычайная сітуацыя на АЭС «Фукусіма-1», то ўжо Беларусь пачала дзяліцца сваімі напрацоўкамі. З таго часу да нас прыехала не адна японская дэлегацыя, якая вывучала наш постчарнобыльскі досвед. А па выніках аднаго з візітаў быў заключаны кантракт на пастаўку ў гэтую ўсходнюю краіну прыбораў дазіметрычнага і радыяцыйнага кантролю беларускай вытворчасці.

Дарэчы, цяпер ідуць перагаворы аб пастаўках нашай пажарна-выратавальнай тэхнікі, а таксама амуніцыі ў краіны Сярэдняй Азіі.

## Дзесяць дзён аўтаномнасці

— Другі блок — супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, — працягвае суразмоўца. — Наш Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння атэставаны па стандартах INSARAG. Гэта патрабаванне ААН да адмысловых атрадаў, якія гатовы аператыўна вылятаць і аўтаномна працаваць у пацярпелай краіне да дзесяці сутак. Прычына вылету — надзвычайная прыродная сітуацыя. Гэта землятрусы, паводкі, тайфуны і цунамі. Прычым усе удзельнікі такога атрада абавязкова павінны валодаць англійскай мовай.

Нашы ратавальнікі актыўна працуюць у праграмах трансмежнага супрацоўніцтва па лініях Беларусь—Латвія—Літва і Беларусь—Польшча—Украіна. І гэта не толькі інвестыцыі ў навучанне ратавальнікаў. Напрыклад, у Брэсце быў пабудаваны Цэнтр бяспекі, праводзіцца рэканструкцыя будынка пажарнай аварыйна-выратавальнай часці,



а былы штаб казармы рэканструюецца пад вучэбны цэнтр. Дзе-нідзе дзякуючы грантам закупляецца сучасная пажарная тэхніка і абсталяванне. Так, у 2019 годзе нашы ратавальнікі рэалізавалі агульных праектаў на сур'ёзную суму ў 14 мільёнаў еўра.

## Ратавальнікі на землятрусе

Імавернасць узнікнення буйнамаштабнай надзвычайнай сітуацыі існуе ў многіх пунктах зямнога шару. І справа зусім не ў тэхнагенных катастрофах, дзе не ў апошнюю чаргу вінаваты славуты чалавечы фактар. Раз-пораз у свеце здараюцца магутныя землятрусы. Усяго некалькі дзясяткаў хвілін падземных штуршкоў і ваганняў — і ў руіны могуць ператварыцца цэлыя гарады.

**Гэтыя вучэнні ратавальнікаў найбольш статусныя з усіх, што праводзяцца ў Еўрапейскім саюзе, паколькі ўключаюць рэагаванне на надзвычайную трансмежную сітуацыю ў рэжыме рэальнага часу.**

Канешне, калі паглядзець на параўнальную карту эпіцэнтраў землетрасенняў, то Беларусь — адна з нямногіх краін свету, дзе яны ўвогуле не былі адзначаны як мінімум з 1963 года. Хоць хвалі да нас перыядычна дакочваюцца — згадаць хоць бы землятрусы ў Калінінградскай вобласці Расіі або ў Румыніі. Але 7 з 15 найбольш разбуральных землятрусаў у гісторыі чалавецтва адбыліся ў XX і XXI стагоддзі. А значыць, дапамога нашых ратавальнікаў можа спатрэбіцца ў любы момант. Ці гатовы яны да гэтага?

— Нашы ратавальнікі ўдзельнічалі ў буйнамаштабных вучэннях, якія праходзілі ў Даніі ў 2017 годзе, — згадвае Дзмітрый Ткачук. — Там адпрацоўваўся механізм грамадзянскай абароны Еўрапейскага саюза ў галіне пошукава-выратавальных работ. Заадно там праверылі на трываласць існуючую міжнародную каардынацыю.

Гэтыя вучэнні ратавальнікаў найбольш статусныя з усіх, што праводзяцца ў Еўрапейскім саюзе, паколькі ўключаюць рэагаванне на надзвычайную трансмежную сітуацыю ў рэжыме рэальнага часу. У адпаведнасці з легендай, Беларусь атрымала выклік аб дапамозе ад пацярпелага боку. Выратавальны атрад сабраўся ў Мінску на базе Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння. Пасля таго як было пагружана неабходнае абсталяванне і вызначаны неабходныя задачы, выратавальныя аўтамабілі паехалі ў Данію...

Крыху слоў пра перадгісторыю такіх вучэнняў. У 1980-я ў свеце адбыліся два вельмі разбуральныя землятрусы. У 1985 годзе падземныя штуршкі магнітудай 8.1 па шкале Рыхтэра скаланулі горад Мехіка. Тады пад абломкамі дамоў загінула каля 10 тысяч чалавек, яшчэ 30 тысяч атрымалі раненні. Сто тысяч засталіся без даху над галавой. Мінула тры гады — і яшчэ больш магутны Спітакскі землятрус накрыў паўночны захад тагачаснай Армянскай ССР. Там ужо колькасць загінулых складала 25 тысяч, а свайго жытла ў адзін момант пазбавіліся 514 тысяч чалавек...

— Менавіта тады сусветная супольнасць зразумела, што вельмі складана каардынаваць вялікую колькасць ратавальнікаў з усёй планеты, — працягвае Дзмітрый Ткачук. — А сама пацярпелая краіна фактычна знаходзіцца ў рэжыме надзвычайнага становішча і не можа аператыўна распрацаваць нейкі механізм, які б дазваляў рэгламентаваць, у якой зоне праводзіць работы, дзе знаходзіцца найбольш прыярытэтны напрамак, дзе можна размясціць базавы лагер і пасля ў парадку ратацыі праводзіць работы. Гэта прыводзіла да таго, што ў той жа Арменіі выратавальныя атрады некалькі разоў абследавалі незалежна адзін ад аднаго тыя ж самыя разбураныя будынкі. А ў гэты час, магчыма, хтосьці чакаў дапамогі пад заваламі наступнага дома і лік ішоў на хвіліны, каб яго выратаваць. З-за гэтага ўмовы працы былі максімальна набліжаны да рэалістычных. У тым ліку — і з пранікненнем унутр завалаў, а таксама выцягваннем адтуль пацярпелых, ролю якіх выконвалі статысты.

Разам з беларускімі ратавальнікамі ў тых вучэннях удзельнічалі атрады з Вялікабрытаніі і Францыі. Калі параўноўваць узровень працы, то наколькі ён адрозніваецца?

— Па аснашчанасці абсталяваннем нашы атрады і еўрапейскія знаходзяцца на супастаўным узроўні, — заўважае Дзмітрый Ткачук. — Мы можам выконваць аднолькавы спектр работ. Крыху адрозніваюцца могуць толькі методыкі — але гэта склалася гістарычна. Ды і тут розніца вельмі нязначная, і гэтыя варыяцыі маюць права на жыццё. Але ў чым нашы ратавальнікі дадуць фору, дык гэта ў згуртаванасці і натхнёнасці на выкананне пастаўленых задач.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Весткі з месцаў

# «ХТО ЗАБЫЎ СВАІХ ПРОДКАЎ — СЯБЕ ГУБЛЯЕ,

## хто забыў сваю мову — ўсё згубіў»

**У Скідзелі — горадзе-спадарожніку Гродна — тры сярэднеадукацыйныя школы з навучаннем на рускай мове. Аднак у СШ № 2 ёсць адзін беларускамоўны клас, і ў ім ужо сёмы год вучацца шэсць дзяўчынак і два хлопцы. Усяго — восем вучняў. Чым не раскоша?**

Самі сямікласнікі згаджаюцца, што належаць у пэўным сэнсе да школьнай эліты, за што ўдзячныя сваім бацькам, бо беларускі клас некалі быў адкрыты менавіта па іх заявах. І вучні цяпер лічаць, што ў рускамоўным асяроддзі — і горада, і сваёй школы — ніколі не змаглі б авалодаць роднай мовай на тым узроўні, які ўжо набылі: у іх і настаўнікі выдатна выкладаюць па-беларуску, і падручнікі ўсе адпаведныя...

Мне захацелася папрысутнічаць на адным з урокаў — у Алены Мікалаеўны Ваўчок, вопытнага педагога і класнага кіраўніка 7 «В».



Вучні 7 «В» з настаўнікамі Пятром Паўлавічам МІКАЛАЕВЫМ і Аленай Мікалаеўнай ВАЎЧОК.

Прызнаюся, спачатку адчувала сябе нібы ў замежжы, настолькі нязвыкла было чуць сярод падлеткаў лёгкую чыстую беларускую мову. І гэта пры тым, што ўрок пачаўся з паўтору такой складанай тэмы, як дзеепрыслоўе і правапіс з ім часціцы «не»...

Затым вучні праходзілі ўстойлівыя выразы і тлумачылі іх сэнс: «спаліць за сабой масты» — «парваць з мінулым», «хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе...» — якраз наадварот.

Падчас урока кожны з вучняў меў магчымасць праявіць свае веды, высокую культуру і павагу да аднакласнікаў: ніхто з іх не імкнуўся вылучыцца, быць найлепшым, не цягнуў руку вышэй за сябра, а наадварот, як бы саступаў яму.

...Як толькі зазвінеў званок, мне давялося пазнаёміцца з вучнямі. Аляксандра Варацілава і Арына Пазняк вельмі занятыя школьніцы: пасля ўрокаў у СШ № 2 яны спяшаюцца ў дзіцячую школу мастацтваў, дзе вучацца па класе «скрыпкі». Акрамя таго, Аляксандра спявае ў хоры Нядзельнай школы Свята-Міхайлаўскай царквы і лічыць, што ў Беларусі, дзе дзве дзяржаўныя мовы, юрыст з дасканалым валоданнем беларускай (а дзяўчына марыць аб гэтай прафесіі) можа быць вельмі запатрабаваны.

...Класны кіраўнік Алена Мікалаеўна расказала, што яе вучні з задавальненнем удзельнічаюць у конкурсах сачыненняў, арганізоўваюць святкаванні Міжнароднага дня роднай мовы 21 лютага, запрашаюць на класныя гадзіны людзей, якія размаўляюць па-беларуску ў паўсядзённым жыцці. Напрыклад, апошнім часам яны сустракаліся з гродзенскай паэткай Галінай Самойла, якая родам з недалёкай вёскі Бандары, са скідзельчанкай Таццянай Савянковай, кіраўніком Мількаўшчынскага краязнаўчага музея на радзіме Элізы Ажэшкі.

...За некалькі хвілін да наступнага ўрока на дошцы з'явілася «Карта тэрыторыі Беларусі XVI — XVIII стагоддзяў часоў Вялікага Княства Літоўскага». Прыемна было ўбачыць на ёй Скідзель. Настаўнік гісторыі Пётр Паўлавіч Мікалаеў пачаў рыхтавацца да ўрока ў адным з найлепшых класаў.

**Тамара МАЗУР,**

*г. Скідзель.*

**Фота аўтара.**

Так ці не?

# «Птушкі лятаюць чародамі...»

**«Я часта гляджу тэлеканал «Беларусь 3» і бачу там надпіс «Канал сапраўдных каштоўнасцей». На мой погляд, апошняе слова трэба пісаць не праз «е»... Ці я памыляюся?» — цікавіцца спадар Пятро Харэцкі.**

**У спадарыні Таісы Губаравай два пытанні: як перакласці на беларускую выраз «продолжение следует» і ці правільна казаць «зграя лебедзяў», «зграя варон»?**

*Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць* ***стыльрэдактар «Звязды» Алесь Саламевіч****, а таксама* ***рэдактар і перакладчык Леў Глушыцкі.***

1. Спадар Харэцкі закрануў вельмі актуальнае пытанне. Справа ў тым, што сёння ў беларускіх тэкстах «канкуруюць» два канчаткі (не пад націскам): -ей і -яў. Калі азірнуцца назад, то можна ўпэўніцца, што ў часы беларусізацыі 1920-х гадоў шырока выкарыстоўваўся менавіта апошні — канчатак -яў. Вось прыклады: *Сталь не блішчыць люстэркам, не адбівае ў глянцу пукатасцяў яго, Міхалкавага, твару...»* (З. Бядуля, «Узвышша» (1927, № 5). Альбо: *Гэткі час — разгар кіпучай працы, // Віхры радасцяў, жаданняў і надзей...* (А. Звонак, «Маладняк» (1927, № 4).

Пазней даволі доўгі час у навуковым, афіцыйна-справавым, публіцыстычным стылях панаваў канчатак -ей. Аднак цяпер, калі ў грамадстве паўстала вялікая цікавасць да мовы першай траціны мінулага стагоддзя, калі (як піша ў сваім досыць аўтарытэтным даведніку спадар Пятро Жаўняровіч) «назіраецца пашырэнне формаў з ненаціскным канчаткам -яў», ён, гэты канчатак, заканамерна і апраўдана вяртаецца ў нашы тэксты. (У тым ліку — на старонках «Звязды»).

2. Пераклад на беларускую мову слова «следовать» і сапраўды часта выклікае праблемы. Напрыклад, «поезд следует» трэба перакладаць як *цягнік ідзе*, «следовать моде или примеру» — *прытрымлівацца іх*, «одно следует из другого» — *адно вынікае з другога*, а «продолжение следует» — як ***працяг будзе***. Гэтыя словы мы сустракаем у часопісах, якія па частках друкуюць раманы або ў канцы пэўнай серыі шматсерыйнага фільма на тэлебачанні.

3. Што да слова *зграя*, то тут мы маем справу з уплывам рускай мовы на беларускую. У першай можна сказаць *пробежала стая собак* і *пролетела стая лебедей*. У нашай жа мове ёсць строгае раздзяленне. У ваўкоў, сабак і падобных жывёл — **зграі**. Імі са злосці могуць назваць і нейкія бандыцкія хеўры — *фашысцкія зграі...*

А вось птушкі ў нас лятаюць **чародамі**.

Дарэчы, гэтае слова мае досыць шырокае значэнне. Яго часта выкарыстоўваюць яшчэ і ў адносінах да кароў, авечак, іншых жывёл і прадметаў, а таксама ў пераносным значэнні: *прамільгнула чарада гадоў.*

### У АБАРОНУ СЛОЎ

У нашай мове ёсць вядомае кожнаму слова **прыбіральня.** А яшчэ ёсць слова **туалет.** Некаторыя стараюцца яго пазбягаць, хоць гэта, як выглядае, і неапраўдана, бо, паводле «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», слова запазычана ў нашу мову яшчэ ў XVIII стагоддзі. Значыць, ім карыстаецца не адно пакаленне — яшчэ і літаратараў: *Ды на людзях Саша саромеўся пераадзявацца, а туалет быў такі, што не схаваешся* (Павал Місько. «Градабой»). *Вырашылі пабудаваць туалет, ды не абы-які* (Рыгор Барадулін. «Здубавецця»).

Даты

# КАХАННЕ + КАМП'ЮТАР,

## або ШТО ЯШЧЭ СВЯТКАВАЦЬ 14 ЛЮТАГА

**Свята ўсіх закаханых, якое адзначаецца ў гэты дзень, лёгка «прапісалася» на абшарах СНД, у тым ліку — і ў Беларусі. Скептыкі, праўда, казалі пра яго камерцыйнасць, пра недакладнасць фактаў...**

Паводле іх, у Рымскай Імперыі жыў звычайны лекар і святар на імя Валянцін, які ўпотай асвячаў шлюбы няшчасных закаханых...

Магчыма, гэта адна са шматлікіх легендаў, але ж ці так усё важна, калі ёсць прыгожае рамантычнае свята?.. І нават не адно, бо менавіта 14 лютага 1946 года ў ЗША быў прэзентаваны першы рэальна працуючы камп'ютар (да таго ж, якраз сёлета споўніцца 60 і першаму беларускаму)...

Адным словам, ёсць што святкаваць, ёсць з чым віншаваць і праз інтэрнэт дасылаць пажаданні — амаль у любы пункт свету.

**Наталля Ружыцкая,**

*г. Мінск.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На чужых памылках

# НЕЛЬГА ДАВЕРЛІВА СТАВІЦЬ ПОДПІС

**Жыццё — вельмі мудры настаўнік, і свае ўрокі ён дае нам змалку. Добра было б засвойваць іх раз і назаўсёды. Але...**

Часам мы не адразу ўсё разумеем, а спытаць саромеемся ці не маем у каго, хаваем свае праблемы, трымаем у сабе, аж пакуль не наступіць момант, калі назапашаны груз ужо не панесці...

Дык мо не трэба вось такога чакаць, а лепш выносіць на старонкі газеты, дзяліцца з людзьмі, звяртацца па дапамогу да Бога, які не выдасць нашых сакрэтаў — прасіць. І хай будзе пададзена.

...Маёй блізкай прыяцельцы Марыі Сцяпанаўне цяпер пад 80. Не так даўно яны з мужам пераехалі ў наша мястэчка з горада. Сын дапамог ім купіць досыць камфортны дом. Новыя гаспадары адразу ж сталі даводзіць да ладу вялікі ўчастак: пасадзілі сад, пад шнурочак разбілі грады, дзе клопатам гаспадароў вельмі шмат чаго і расло, і цвіло.

Што важна, у кожнай справе побач з гаспадыняй быў гаспадар — быў, пакуль не стала падводзіць здароўе. А ўжо тады...

Дактары досыць хутка здаліся, сказалі, што больш нічога прапанаваць не могуць — трэба пераходзіць на абязбольваючыя прэпараты. Вось толькі жонка з імі не пагадзілася. Яна знайшла ў інтэрнэце незвычайную методыку лячэння, заснаваную на строгім харчаванні, днямі стаяла ля пліты, строга па гадзінах на прыгожа сервіраваны стол выстаўляла стравы, разнастайныя свежыя сокі і травяныя настоі. Зблоку можна было падумаць, што дома ў іх кожны дзень свята...

На восем гадоў Марыя Сцяпанаўна прадоўжыла жыццё свайму чалавеку і ўсё ж засталася адна.

Спачатку, ведаю, разгубілася, бо ёй не трэба было нікуды спяшацца, не было аб кім клапаціцца — стала хварэць сама. Ехаць у горад да сына адмовілася. Стала болей чытаць, глыбей асвоіла камп'ютар, наведвала выстаўкі і музеі ў Мінску, адшукала старых сябровак. Усё больш ёй патрэбен быў скайп і хатні тэлефон, хоць гэта задавальненне для нас, пенсіянераў, не вельмі таннае...

І гэта я параіла Марыі Сцяпанаўне падключыцца на тарыф, які выбрала некалі для сябе (там за 30 рублёў — безлімітны інтэрнэт, шматканальнае тэлебачанне «ZALA» і бясплатныя званкі з хатняга тэлефона па ўсёй Беларусі). Жанчына згадзілася, зрабіла заяўку, праз два дні прыехала майстра, які ўсё падключыў. Яны падпісалі дагавор, і, здавалася б, усё — справа зроблена. Марыя Сцяпанаўна стала смела тэлефанаваць сваім родным і сябрам. Яшчэ і рэкламу рабіла новаму тарыфу. А потым атрымала квіток на аплату і...

Убачыўшы суму, жанчына, як потым прызналася, уголас плакала. Аказалася, што дагавор уступаў у сілу не адразу, а праз... 20 дзён пасля падключэння.

Узнікае пытанне: **ХТО ВІНАВАТЫ?** Пажылая жанчына, якая даверліва паставіла подпіс на дагаворы памерам у сем надрукаваных старонак, ці майстар, які не засяродзіў яе ўвагу на пэўнай даце, не патлумачыў ёй, што да чаго?

Я не ведаю адказу на гэта пытанне. Адно разумею: прымаючы нейкія важныя рашэнні, нельга цяпер расслабляцца. Трэба загадзя ўсё прадумваць, магчыма, перапытваць, удакладняць, каб потым не праліваць горкіх слёз.

**НЕ ТРЭБА** забываць і пра тое, што пад выглядам розных майстроў і праваючых у хату могуць прыйсці звычайныя ашуканцы. Жыццё прывучае нас быць пільнымі і ва ўсё ўнікаць.

**Галіна С.,**

*г. Мінск.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

# МАГЧЫМАСЦЬ БЫЦЬ РАЗАМ

**Права на аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, заключэнне калектыўных дагавораў, пагадненняў (як частка права на ахову эканамічных і сацыяльных інтарэсаў) даецца кожнаму беларусу самой Канстытуцыяй. Работніку — члену прафсаюза не даводзіцца самастойна вырашаць пытанні распарадку дня, аплаты водпуску, выплаты дапамогі і гэтак далей — аж да бяспекі на працоўным месцы.**

**Вынікі пяцігодкі падвядзём разам са старшынёй Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Таццянай ФІЛІМОНАВАЙ.**



***— І давайце пачнём з таго, колькі нас і якія мы.***

— На пачатак года ў наш прафсаюз уваходзілі 113 447 чалавек. З іх працуючых 97 654 члены прафсаюза, студэнтаў і навучэнцаў — 11 678, непрацуючых, якія стаяць на прафуліку, — 4115.

У саюз уваходзяць пяць абласных арганізацый, адна гарадская (з правамі абласной), 121 раённая і гарадская, 1692 першасныя прафсаюзныя арганізацыі, у тым ліку 26 прафарганізацый навучэнцаў і студэнтаў.

З 2015 да 2019 года колькасць Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму павялічылася на 7838 чалавек.

***— Работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб — адзін з прыярытэтаў у дзейнасці прафсаюза. З якімі пытаннямі часцей за ўсё звяртаюцца людзі?***

— Праблематыка разнастайная. Так, з 2015-га па 2019 год у прафсаюз паступіла больш за 16 тысяч пісьмовых зваротаў, амаль 17 тысяч грамадзян звярнуліся на асабісты прыём, і найбольш актуальнымі застаюцца пытанні аказання матэрыяльнай дапамогі, а таксама санаторна-курортнага абслугоўвання, прававыя пытанні, пытанні аховы працы. Звяртаюцца грамадзяне па тлумачэнне ўмоў аплаты працы, выплат надбавак і прэмій, па жыллёва-бытавых пытаннях.

У параўнанні з 2010—2014 гадамі колькасць пісьмовых зваротаў за апошні час зменшылася на 34 %, колькасць вусных — на 12 %. На 261 выязны прыём для грамадзян у рэгіёнах звярнулася 703 чалавекі. Штомесяц праводзяцца гарачыя лініі.

Найбольш хвалююць грамадзян нізкі ўзровень заработнай платы ў арганізацыях галіны культуры і мастацтва; заключэнне, падаўжэнне і скасаванне кантрактаў; даванне працоўных адпачынкаў; невыкананне дадатковых гарантый, устаноўленых для работнікаў калектыўнымі дагаворамі і пагадненнямі; праблемы працаўладкавання ў сувязі з аптымізацыяй, якая праводзіцца ў краіне; складанасці пацверджання працоўнага стажу, неабходнага для прызначэння пенсіі па ўзросце; парадак вядзення ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, працоўныя адносіны з асобамі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту; даванне льгот ліквідатарам наступстваў аварыі на ЧАЭС; даванне льгот маладым спецыялістам.

***— Пад пастаянным кантролем прафсаюза знаходзяцца і пытанні калектыўна-дагаворнага рэгулявання. Раскажыце, калі ласка, аб тэндэнцыях у гэтай сферы.***

— За гэты час колькасць першасных арганізацый, якія ўваходзяць у структуру прафсаюза, павялічылася на 32 %, колькасць калектыўных дагавораў у арганізацыях — на 35 % (летась дзейнічала 1549 калектыўных дагавораў).

Колькасць чалавек, на якіх распаўсюджваецца дзеянне калектыўных дагавораў, павялічылася з 2015-га па 2019 год на 8 % — да 112 396 чалавек.

У 2019-м у параўнанні з 2015 годам у тры разы павялічылася сума сродкаў, выплачаных у адпаведнасці з калектыўнымі дагаворамі (за 2019 год было выплачана 58 520 360 рублёў).

Нагадаю чытачам, што з 2012 года раз у два гады праводзіцца агляд-конкурс «Лепшы калектыўны дагавор» прафсаюза. Чарговае падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца да першага красавіка (першы тур конкурсу) і да першага мая (другі тур).

***— Прафсаюз заўсёды актыўна ўдзельнічае ў нарматворчай дзейнасці. Праекты нарматыўных прававых актаў, якія ўносяцца ва ўрад Беларусі і закранаюць працоўныя і сацыяльна-эканамічныя правы і інтарэсы работнікаў арганізацый, прадстаўляюцца для разгляду і ўнясення заўваг і прапаноў у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі. Якія, на вашу думку, найбольш актуальныя навінкі?***

— Сапраўды, у 2018 годзе прафсаюз узяў удзел у распрацоўцы больш за 30, а летась — больш за 50 праектаў нарматыўных прававых актаў.

Напрыклад, пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.07.2013 № 641 не прадугледжвае накіравання выкарыстання пазабюджэтных сродкаў для правядзення культурна-масавых, спартыўных мерапрыемстваў, навагодніх ёлак, змяншэння кошту дзіцячых навагодніх падарункаў, прапаганды здаровага ладу жыцця, адраджэння нацыянальнай культуры, іншых сацыяльна значных мэт.

Лічу, што неабходна працягнуць працу па ўнясенні змяненняў у пункт 25 гэтага нарматыўнага прававога акта аб магчымасці адлічэння наймальнікамі грашовых сродкаў прафсаюзным арганізацыям на гэтыя мэты ў памеры не менш за 0,15 % ад фонду заработнай платы.

28 студзеня 2020 года ўступілі ў сілу змены і дапаўненні ў Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь; адкарэктаваны Тыпавыя правілы ўнутранага працоўнага распарадку, устаноўлена новая прыкладная форма працоўнага дагавора з работнікам; у новай рэдакцыі выкладзена прыкладная форма кантракта. З яе выключаныя ўмовы аб поўнай матэрыяльнай адказнасці работнікаў, а таксама дадатковыя падставы звальнення, што раней прадугледжваліся для работнікаў, з якімі заключаны кантракты. Усталяваны агульны тэрмін выплаты сярэдняга заробку за час працоўнага водпуску не пазней чым за два дні да пачатку адпачынку.

Згодна з навоўвядзеннем артыкула 261-2 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, у абмеркаванні зместу кантракта работніка — члена прафсаюза ўдзельнічае прадстаўнік адпаведнага прафсаюза.

**За пяцігодку практычна ва ўсіх арганізацыях і ўстановах галін культуры, інфармацыі, спорту і турызму, якія знаходзяцца ў полі ўплыву прафсаюза, заработная плата выплачвалася ў тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам, калектыўнымі дагаворамі.**

***— Прафесійны саюз клапоціцца не толькі аб сваіх членах, але і аб іх дзецях. Традыцыйная дабрачынная акцыя так і называецца — «Прафсаюзы — дзецям». Што трэба, каб падарыць свята?***

— У акцыю ўключаны летняе дзіцячае аздараўленне, акцыя, прысвечаная Дню ведаў, і правядзенне навагодніх і калядных мерапрыемстваў.

Напрыклад, па галіне ў летні перыяд 2015—2019 гадоў адпачылі 12 066 дзяцей, агульная сума сродкаў, затрачаных з прафсаюзнага бюджэту, склала 140 544,72 рублі. Сярэдні кошт пуцёўкі склаў 465,65 рубля.

Першасныя прафсаюзныя арганізацыі аказвалі дапамогу ў падрыхтоўцы дзяцей да новага навучальнага года. Набываліся канцылярскія тавары для дзяцей падшэфнага дзіцячага прытулку, арганізоўвалася мерапрыемства «Неверагодныя прыгоды ў краіне ведаў».

У дні святкавання Дня беларускага пісьменства ў рамках XXV навукова-асветніцкай канферэнцыі «Дарога да святыняў» былі скамплектаваныя бібліятэчкі для перадачы сярэднім школам.

У цэлым першаснымі прафсаюзнымі арганізацыямі, якія знаходзяцца на прафсаюзным абслугоўванні ў Цэнтральным камітэце прафсаюза, аказана матэрыяльная дапамога работнікам на агульную суму 65 882,11 рубля.

А да Новага года і Каляд для выхаванцаў падшэфных устаноў былі арганізаваны навагоднія ранішнікі, салодкія сталы, экскурсіі ў Палацы культуры, тэатры, уручаны падарункі, а таксама віншаванні выхаванцаў падшэфных устаноў арганізацыямі прафсаюза.

Стала добрай традыцыяй напярэдадні Новага года праводзіць для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту работнікаў-членаў галіновага прафсаюза ранішнікі і іншыя масавыя калядныя ды навагоднія мерапрыемствы з уручэннем падарункаў, наведваннем навагодніх пастановак у тэатрах, палацах і дамах культуры.

Прафсаюзныя актывісты наведваюць школы-інтэрнаты, дзіцячыя дамы, у тым ліку сямейнага тыпу, дамы-інтэрнаты для дзяцей-інвалідаў, дзіцячыя сацыяльныя прытулкі.

З кожным годам расце сума грашовых сродкаў, што выдзяляюцца ўсімі структурамі прафсаюза на арганізацыю і правядзенне навагодніх і калядных мерапрыемстваў.

***— І не магу не спытаць пра надзённае... Сфера наша бюджэтная, калі-нікалі даводзіцца сустракаць і прадстаўнікоў галіны, якія твораць, шчыра кажучы, на энтузіязме. Што робіцца для падтрымкі спецыялістаў?***

— Згодна, пытанне павышэння ўзроўню заработнай платы работнікаў галін культуры і мастацтва па-ранейшаму застаецца вельмі важным. За пяцігодку практычна ва ўсіх арганізацыях і ўстановах галін культуры, інфармацыі, спорту і турызму, якія знаходзяцца ў полі ўплыву прафсаюза, заработная плата выплачвалася ў тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам, калектыўнымі дагаворамі, не радзей двух разоў у месяц.

У мінулым верасні Цэнтральны камітэт накіраваў у Савет Міністраў прапановы па павышэнні памераў зарплаты працаўнікам арганізацый галін культуры і мастацтва, спорту і турызму. Па даручэнні ўрада Міністэрства працы і сацыяльнай аховы праінфармавала аб планаваемай рабоце па павышэнні заработнай платы асобным катэгорыям працаўнікоў.

З 1 студзеня ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ўведзена новая сістэма аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. Уводзіцца базавая стаўка ў памеры 185 рублёў. У сувязі з гэтым зараз галоўная задача прафсаюза не дапусціць зніжэння заробкаў сваіх членаў прафсаюза, дзеля чаго са студзеня праводзіцца маніторынг узроўню заработнай платы.

Прафсаюз працягвае актыўную работу ў гэтым кірунку.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Майстар-клас

# НЕ ЎПУСЦІЦЬ РАБОТУ МАРЫ

**Міжнародная выстаўка «Адукацыя і кар'ера — 2020» адбудзецца ў Мінску 13-15 лютага. Пляцоўкай для яе правядзення стане Палац мастацтваў (вуліца Казлова, 3).**

**Мерапрыемства арганізуецца ўжо ў васямнаццаты раз. Яго мэта — дапамагчы абітурыентам, студэнтам, выпускнікам ВНУ, маладым спецыялістам і ўсім, хто цікавіцца сферай адукацыі, знайсці для сябе месца вучобы, курсы дадатковай адукацыі, праграму стажыровак, магчымасці для падпрацоўкі, валанцёрства і гэтак далей.**

На маючай адбыцца выставе можна будзе пагутарыць з прадстаўнікамі больш як 125 універсітэтаў, каледжаў, ліцэяў, адукацыйных цэнтраў, школ па вывучэнні замежных моў з Беларусі, Расіі, Германіі, Польшчы, Швейцарыі, Латвіі, Чэхіі, Літвы.

Каледжы і ліцэі наглядна пакажуць спецыяльнасці, якія можна хутка засвоіць, каб потым зарабляць дзякуючы ім самастойна: увазе гасцей будуць прадстаўлены майстар-класы па мастацкім роспісе пазногцяў, падборы і выкананні макіяжу, пляценні кошыкаў з лазы, лепцы з мастыкі, вырабе сувеніраў з шакаладу, мастацкай нарэзцы садавіны і гароднiны, выкананні карцін у тэхніцы кінусайга, роспісе велікодных яек і іншыя. Для абітурыентаў і студэнтаў, якія мараць стаць запатрабаванымі прафесіяналамі ў лічбавай індустрыі, прадстаўнікі профільных ВНУ, курсаў, адукацыйных цэнтраў раскажуць пра кар'еру ў IT.

Паводле статыстыкі, больш як 80 працэнтаў студэнтаў працуюць далей не па спецыяльнасці. Чаму? Адказ на гэта пытанне можна будзе пачуць на інтэрактыўнай лекцыі «Кар'ерны коўчынг — што гэта? Як выбіраць прафесію не па школьных адзнаках, а па таленце», якую правядзе Ганна Філатава, сертыфікаваны кар'ерны коўч, спецыяліст у галіне развіцця кар'еры. Таксама яна раскажа, як напісаць рэзюме, калі вопыт працы адсутнічае. А Анастасія Карэліна, менеджар па маркетынгу і PR, запрашае пагутарыць аб відавочным, але часам неверагодным: як знайсці працу, калі пакуль не ведаеш, што і як шукаць?

Для студэнтаў і выпускнікоў будзе шмат карыснай інфармацыі па атрыманні другой вышэйшай адукацыі і павышэнні кваліфікацыі. А для навучэнцаў і абітурыентаў 13 і 15 лютага ў канферэнц-зале на другім паверсе пройдуць займальныя прафарыентацыйныя настольныя гульні «Профільплюс» і «Праффарсайт», якія дапамогуць пашырыць кругагляд аб сучасным свеце прафесій і развіць навыкі пошуку і аналізу інфармацыі.

Час работы выстаўкі «Адукацыя і кар'ера» 13 і 14 лютага з 10.00 да 18.00, 15 лютага з 10.00 да 16.00.

Яе арганізатарам выступае выставачнае прадпрыемства «Экспафорум» (падрабязную праграму ўсіх мерапрыемстваў фестывалю можна знайсці на сайце http://eduexpo.by/#program). Уваход на выстаўку вольны, але арганізатары просяць скарыстацца папярэдняй электроннай рэгістрацыяй, каб атрымаць запрашальны білет, які дае права бясплатнага наведвання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЦЯПЛО Ў ХАТУ ЗА МЕНШУЮ АПЛАТУ

## НЕАБХОДНАСЦЬ У КАМФОРЦЕ

Да 1996 года патрабаванні да будаўніцтва шматкватэрных дамоў былі зусім іншыя — у той час ужываліся другія стандарты, тэхналогіі ды матэрыялы. Пра такое паняцце, як «энергаэфектыўнасць дома», тады ніхто і не чуў. Таму цяпер у большасці старэйшых за 20 гадоў будынкаў спажыванне энергіі вельмі высокае — у сучасных шматкватэрных дамах гэтыя лічбы мінімум у два разы меншыя. Але самае галоўнае тут, што ўласнікі кватэр у старым жылфондзе больш плацяць за цяпло, а ўмовы іх пражывання не заўсёды можна назваць камфортнымі — у адных кватэрах вельмі холадна, у іншых — наадварот — занадта горача.

— Сёння насельніцтва спажывае цяпла на 970 мільёнаў долараў, 778 мільёнаў з іх аплачвае дзяржава, гэта значыць, што мы з вамі аплачваем толькі 20 % ад рэальнай лічбы. Толькі 9 % шматкватэрнага жылога дома з'яўляюцца энергаэфектыўнымі, усе астатнія спажываюць у два, а то і ў чатыры разы больш энергіі, чым патрэбна, — адзначае **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, кіраўнік Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Міхаіл МАЛАШАНКА.** — Выходзіць, што амаль усе дамы не з'яўляюцца энергаэфектыўнымі. Менавіта таму дзяржава павялічвае долю аплаты насельніцтвам паступова. Але вельмі важна разумець, што сёння на кампенсацыю астатніх 80 % сабекошту энергіі ідуць сродкі бюджэту, сродкі ад перакрыжаванага субсідзіравання, і ніхто з нас нават не задумваецца, што гэта таксама нашы грошы, і бясплатнага нічога не бывае.

Пры гэтым многія памылкова лічаць, што энергаэфектыўнасць дома можна павысіць за кошт капітальнага рамонту, але гэта не зусім так. Вядома, ён дазваляе аднавіць асноўныя якасці будынка, напрыклад, адрамантаваць дах, фасад ці сістэму вентыляцыі, а вось камфортныя ўмовы для пражывання ствараюцца ўжо пры дапамозе цеплавой мадэрнізацыі. І менавіта дзякуючы гэтым мерапрыемствам у доме будзе цёпла, уласнік зможа кантраляваць тэмпературу ў сваёй кватэры, але галоўнае — ён з цягам часу пачне эканоміць свае сродкі.

## НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ АДНОСІН

На цеплавую мадэрнізацыю, як і на капітальны рамонт, патрэбны грошы. І любы ўласнік прыватнага дома напэўна ведае, што гэта вялікія затраты. У шматкватэрным доме ўсё значна прасцей — уласнікі сумеснага домаўладання дзеляць гэтыя затраты паміж сабой. Але і гэтага аргумента не заўсёды дастаткова — многія з іх проста не жадаюць стварaць для сябе камфортныя ўмовы за свой кошт. Менавіта таму ў краіне і пачалі шукаць альтэрнатыўныя варыянты рашэння праблемы — у верасні Прэзідэнт падпісаў Указ № 327 «Аб павышэнні энергаэфектыўнасці шматкватэрных жылых дамоў». Фактычна гэты дакумент дазволіў запусціць праект, у рамках якога будзе праводзіцца цеплавая мадэрнізацыя шматкватэрных дамоў на Гродзеншчыне і Магілёўшчыне.

— Указ мы распрацоўвалі разам з кансультантамі Сусветнага банка і ён заснаваны на вопыце іншых краін. Аднак пакуль гэтая праграма (менавіта з вылучэннем сродкаў міжнародных фінансавых структур. — **Рэд.**)



з'яўляецца пілотнай, і разлічана толькі на Гродзенскую і Магілёўскую вобласці, дзе за пяць гадоў плануецца правесці цеплавую мадэрнізацыю ў 250 шматкватэрных дамах, — кажа Міхаіл Малашанка. — І вельмі добра, калі мы імкнемся да эканоміі энергарэсурсаў, зніжэння аплаты паслуг жыллёва-камунальнай гаспадаркі, але самае галоўнае на сёння тое, што дзяржава дала насельніцтву магчымасць выбіраць. І ні ў адной краіне свету не было створана такіх прывілеяваных умоў для людзей.

Разлічваць на цеплавую мадэрнізацыю ў рамках гэтай праграмы змогуць тыя дамы, якія знаходзяцца ў чарзе на капітальны рамонт, але толькі ў тым выпадку, калі ўласнікі будуць на гэта згодны. На першым этапе дзяржава возьме на сябе ўсе затраты па цеплавой мадэрнізацыі і аплаціць усе пажаданні ўласнікаў. Пасля ўкаранення ўсёй сістэмы ўласнікі пачнуць вяртаць толькі палову затрачаных на гэта сродкаў, астатняе дзяржава па-ранейшаму пакіне за сабой. У чалавека будзе магчымасць зрабіць аднаразовую выплату ці плаціць беспрацэнтную растэрміноўку на працягу дзесяці гадоў, і гэта будзе толькі яго рашэнне. Калі ж грамадзянін будзе знаходзіцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы, гэты тэрмін павялічаць да 15 гадоў.

— Слонім — першы горад, дзе будзе рэалізоўвацца гэтая праграма, і ў гэтым плане жыхарам горада вельмі пашанцавала. На іх дамах будзе сканцэнтравана ўся ўвага, як Дэпартамента і абласных улад, так і спецыялістаў Сусветнага банка. Цалкам мы будзем пастаянна атрымліваць кансультацыю ў спецыялістаў, якія займаюцца такімі пытаннямі больш за 20 гадоў. Яны будуць кансультаваць чыноўнікаў, праектантаў і падрадчыкаў. Яны навучаць нас рабіць гэта эфектыўна і з найменшымі затратамі, — лічыць Міхаіл Пятровіч.

## РАЦЫЯНАЛЬНАЕ КАРЫСТАННЕ

Калі больш удавацца ў дэталі праекта... Уласнікам будуць прапаноўваць два варыянты цеплавой мадэрнізацыі. Першы з іх дазволіць знізіць кошт цяпла на 15 %. Уласнікам заменяць вокны і дзверы ў пад'ездах, усталююць рэгулятары на батарэі ў кватэрах і пабудуюць індывідуальны цеплавы пункт. Акрамя гэтага, на батарэях з'явяцца і размеркавальнікі цяпла з дыстанцыйнай перадачай інфармацыі. Гэта дазволіць уласнікам плаціць толькі за тое, што спажыла іх кватэра. У другім выпадку кошт цяпла стане менш на 50 %, але гэты комплекс паслуг будзе больш дарагі. Да ўсяго пералічанага вышэй дабавяць яшчэ ўцяпленне сцен, гарышча і цокаля, а таксама заменяць вокны ў кватэрах, калі ўласнікі гэтага не зрабілі раней.

— Гэты комплекс работ — умоўнасць, можна выбраць любы з іх. Таксама ўласнікі могуць выбраць першы варыянт, адчуць вынік і праз час заказаць дадатковы комплекс работ. Другі варыянт дазваляе больш рацыянальна выкарыстоўваць цеплавую энергію, — кажа Міхаіл Малашанка. — Аднойчы ў Мінску мы праводзілі параўнальны аналіз двух аднолькавых дамоў, у адным з іх уласнікі вырашылі разам плаціць за цяпло, у другім — наадварот — кожны пажадаў плаціць толькі за сябе. Гэта іх рашэнне, але факт застаецца фактам, у другім доме спажыванне энергіі менш на 15 %, чым у першым, бо тыя ўласнікі рэгулююць тэмпературу ў памяшканні рэгулятарам, а не форткай.

Калі ж казаць пра канкрэтныя лічбы, то на працягу 10—15 гадоў уласнікі двухпакаёвай кватэры штомесяц будуць аддаваць ад 20 да 27 рублёў за растэрміноўку. Пры гэтым яны будуць значна эканоміць на спажыванні энергіі. А гэта значыць, што калі ўласнік плаціў за цяпло 20 рублёў, то ён пачне плаціць 17 ці 12 у залежнасці ад выбранага комплексу паслуг. Але ж трэба разумець, што праз гады гэтыя сумы будуць толькі павялічвацца, і эканомія стане толькі больш важкай.

## НЕ ЎПУСЦІЦЬ ШАНЦ

Вырашыцца на такі крок заўсёды не проста, але вопыт іншых краін толькі даказвае, што ўсё гэта не проста выгадна, а гэта шанц, якога можа потым і не быць. Літва некалі сутыкнулася з падобнымі праблемамі — больш за палову жыхароў краіны-суседкі жылі ў шматкватэрных дамах, якія былі пабудаваны яшчэ да 1993 года і мелі такія ж праблемы з цеплавой ізаляцыяй. Аднак у 2004 годзе была створана праграма, у рамках якой ва ўласнікаў з'явілася магчымасць мадэрнізаваць свой дом.

Удзельнікі гэтага праекта маюць права на 30-працэнтную дзяржаўную субсідыю толькі ў тым выпадку, калі пасля ўсіх мерапрыемстваў яны паменшаць спажыванне цяпла не менш чым на 40 %. Для будаўнічых работ на першыя пяць гадоў уласнікі атрымліваюць крэдыт пад 3 % гадавых, які яны будуць выплачваць на працягу 20 гадоў. Пры гэтым у мадэрнізацыю ўваходзіць і кошт работ па капітальным рамонце, які літоўцы аплачваюць цалкам за свой кошт.

Але трэба заўважаць, што найбольшы прарыў у гэтай справе адбыўся ў 2013 годзе, калі да праблемы падключыліся мясцовыя ўлады. І дзякуючы гэтай праграме ў Літве аднавілі 2300 шматкватэрных дамоў, у 400 цяпер ідзе цеплавая мадэрнізацыя, а зусім хутка яна пачнецца яшчэ ў 1200 дамах. І пры гэтым 10 гадоў таму амаль усе ўласнікі былі настроены вельмі скептычна, нават 40 % з іх выступалі за разбурэнне старога жылфонду, але цяпер іх погляды значна змяніліся, таму што яны ўбачылі вынік і выгаду.

— Гэтая праграма разлічана на пяць гадоў, і ніхто яшчэ не ведае, ці будзе працяг, таму не трэба ўпускаць гэты шанц. Адна беларуская жанчына спытала ў нас, чаму яна павінна плаціць за нейкую мадэрнізацыю. Але ж на самай справе ніхто нікому нічога не павінен, хто хоча, той проста прымае ўдзел, — разважае **кіраўнік Прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Алекс КРЭМЕР.** — У Літве быў падобны праект, і адна жанчына ў гадах сказала, што трэба быць вар'ятам, каб не згадзіцца на такія ўмовы, бо яна сваімі вачыма ўбачыла, якім стаў яе дом. Калі людзі ўбачаць першыя дамы, яны таксама пажадаюць стаць часткай такога праекта. І я не вараджу на кававай гушчы, я грунтуюся на вопыце іншых краін, дзе рэалізоўвалі такія ж праекты.

Алекс Крэмер лічыць, што менавіта гэтая ініцыятыва стане яго любімым праектам у Беларусі.

— У 2000 годзе я набыў дом у Англіі, і на той момант будынку было гадоў сто. Папершае, мне давялося ўцяпліць сцены, таму што ў доме было вельмі холадна. Потым я аднавіў дах, і ўсё роўна, седзячы дома, мы чулі, як на вуліцы свішча вецер. Праз некалькі гадоў, калі я змог назапасіць грошай, я замяніў вокны. А праз тры гады зламалася сістэма ацяплення, прыйшлося замяніць і яе. І ведаеце, я быў бы вельмі шчаслівы, калі б у той момант палову маіх расходаў узяла на сябе дзяржава, а другую палову я плаціў бы без якіх-небудзь працэнтаў на працягу дзесяці гадоў. Менавіта ў гэтым і выяўляецца сённяшні праект у Беларусі. Вы атрымаеце цёплы дом, у якім будзе значна цішэй, чым было дагэтуль, вы будзеце кантраляваць тэмпературу ў памяшканні і калі вы пажадаеце калі-небудзь прадаць сваю кватэру, яе кошт будзе значна вышэйшы. На ўсё гэта вы патраціце толькі палову грошай, якія патрэбны, і ў якасці бонуса вы атрымаеце «лягчэйшую» жыроўку.

## ВАЖНАЕ ПЫТАННЕ

Канешне, ніхто не будзе спрачацца, што гэты праект мае пэўную выгаду, і беларускія ўласнікі прыватных дамоў могуць толькі марыць аб такім падарунку. Але ж пры гэтым трэба грунтоўна адказаць і на пытанне ўласнікаў кватэр аб тым, куды пайшлі грошы, якія яны плаціці за тэхнічнае абслугоўванне і капітальны рамонт. Напрыклад, адлічэнні на капітальны рамонт заўсёды захоўваліся на пэўным рахунку мясцовай улады, і расходуюцца яны толькі на гэтыя мэты. Пры гэтым **галоўны інжынер ДА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гродзенскай вобласці» Андрэй КАХНОВІЧ** адзначае, што адлічэнні грамадзяне пачалі ўносіць толькі ў 1999 годзе, а капітальны рамонт выконваецца не толькі за гэтыя сродкі, але і за сродкі бюджэту.

— Калі б пры выкананні капітальнага рамонту выкарыстоўваліся толькі адлічэнні грамадзян, то спіс работ быў бы значна меншы, таму што на 55 % яго аплачвае бюджэт, — тлумачыць спецыяліст.

Што ж датычыцца тэхнічнага абслугоўвання, то яно дазваляе нам, уласнікам, штодзённа падтрымліваць наш дом у адпаведным стане. У сваю чаргу капітальны рамонт дапамагае нам аднавіць будынак, а вось менавіта цеплавая мадэрнізацыя дазволіць нам жыць у камфортных умовах. І толькі нам вырашаць, жадаем мы гэтага ці не.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падрабязнасці

# У БАРЫСАВЕ ПАЧНЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ПЕЛЕТНЫ ЗАВОД

**Арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі працягваюць будаўніцтва пелетных заводаў. Як паведамлялася раней, да 1 чэрвеня гэтага года ў дзеянне будзе ўведзена шэсць новых вытворчасцяў. Адпаведнае даручэнне было дадзена Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Агульная магутнасць прадпрыемстваў складзе каля 156 тысяч тон пелетаў у год. Вытворчасці размесцяцца ў Барысаўскім, Клічаўскім, Пружанскім, Навагрудскім, Мазырскім і Жыткавіцкім раёнах.**

Чакаецца, што першым увядуць у эксплуатацыю пелетны завод у Барысаве. Яго ўзводзяць на тэрыторыі дзеючага цэха дрэваапрацоўкі вопытнага лясгаса. Па стане на 10 лютага тут ужо выканана больш як 67 % работ, манціруецца тэхналагічнае абсталяванне.

Будаўніцтва вядзецца за кошт асабістых сродкаў лясгаса і з прыцягненнем крэдытных рэсурсаў. Гадавая прадукцыйнасць вытворчасці — 30 тысяч тон. Гэты від прадукцыі — экспартаарыентаваны. Штогод у свеце спажываецца больш за 40 мільёнаў тон пелет. Прычым, па ацэнках экспертаў, з кожным годам гэты паказчык павялічваецца прыкладна на 1,5 мільёна тон. Найбольш актыўнымі спажыўцамі паліўных гранул з'яўляюцца краіны Заходняй Еўропы. У ліку перспектыўных — і краіны Азіі. У прыватнасці, толькі Японія заявіла аб намеры павялічыць да 2030 года аб'ёмы спажывання пелет у дзесяць разоў — да 20 мільёнаў тон.

Будаўніцтва пелетных заводаў дазволіць арганізацыям Мінлясгаса не толькі атрымаць дадатковы прыбытак, але і прыцягнуць у абарот нявыкарыстаныя рэсурсы нізкаякаснай драўніны. Паралельна з узвядзеннем новых вытворчасцяў у галіне пачалася работа па пошуку патэнцыйных пакупнікоў.

Нагадаем, першыя два прадпрыемствы плануюць увесці ў дзеянне да 1 мая, а яшчэ чатыры — да 1 чэрвеня 2020 года.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Урокі прыгажосці

# Ахоўваць і жывіць

## Як даглядаць скуру зімой

**Зіма для скуры — выпрабаванне на трываласць. Халодны вецер на вуліцы, перасушанае батарэямі паветра ў кватэрах, маларухомы лад жыцця — усё гэта не лепшым чынам адбіваецца на знешнасці. У халодныя месяцы скура мае патрэбу ў асаблівым доглядзе. Які ён павінен быць, а таксама пра тое, якія памылкі мы здзяйсняем дзень за днём, думаючы, што дапамагаем скуры, расказала ўрач-дэрматолаг вышэйшай катэгорыі, загадчык дэрматалагічным аддзяленнем медыцынскага цэнтра «ЛОДЭ» Раіса ШЭРШАНЬ.**

**— Раіса Мікалаеўна, што адчувае наша скура зімой? Чаму з ёй узнікае больш праблем у халодны час?**

— Бясспрэчна, навакольнае асяроддзе на нас уплывае, прычым не толькі на скуру твару, а і ўсяго цела. Гэта нізкія тэмпературы на вуліцы, у памяшканнях — ацяпленне, у машыне — абагрэў, з-за чаго зніжаецца вільготнасць паветра, і скура пакутуе. Яна адказвае нам сухасцю, лушчэннем, пачуццём сцягнутасці, пачырваненнем. Мы прызвычаіліся называць гэта сухой раздражнёнай скурай.

Акрамя гэтага, пакутаваць яна можа, калі мы самі занадта старанна яе даглядаем. Напрыклад, многія прымаюць душ з мылам, але калі ў вас, скажам, не фізічная праца, а офісная, той жа гель-душ ці мыла зусім не абавязковыя. Многія імкнуцца змыць рознымі сродкамі скурнае сала з твару, а гэта, між іншым, наш ахоўны бар'ер. У выніку мы дадаем сабе праблем. Скура ўсё роўна застаецца тлустай, пры гэтым дадаткова губляе вільгаць, з-за чаго становіцца яшчэ і абязводжанай. Сёння ў продажы шмат сродкаў, у іх часам складана разабрацца і падабраць без кансультацыі. Але людзі ўсё спрабуюць на сабе і атрымліваюць самыя непрадказальныя эфекты.

**«Калі сістэматычна прыбягаць нават да простых працэдур па доглядзе, то на сустрэчы з аднакласнікамі вы будзеце выглядаць лепш, чым тыя, хто гэтага ніколі не рабіў».**

Адна з тыповых памылак — думаць, што быццам бы зімой тып скуры мяняецца. Ён застаецца ў нас аднолькавым на працягу ўсяго жыцця. Мяняюцца ўмовы надвор'я, а скура, канешне, рэагуе.

**— Няўжо для ўмывання твару дастаткова толькі вады? А якія сродкі па доглядзе неабходна мець абавязкова?**

— Пацыенты нярэдка расказваюць, што мыюць твар з мылам, некаторыя нават з гаспадарчым. Такім чынам змываецца ліпідная мантыя, і скура пакутуе яшчэ больш. Умыцца дастаткова вадой — кіпячонай, бутыляванай, міцэлярнай. Зімой для ачышчэння твару мы таксама можам карыстацца малачком, крэмам-суфле. Але сродак павінен быць бясспіртавым. Далей усё залежыць ад тыпу скуры. Калі яна схільная да тлустасці, пасля ўмывання можна працерці твар бясспіртавым тонікам. Потым наносіцца крэм у адпаведнасці з тыпам скуры. Зноў-такі калі скура тлустая і летам мы карыстаемся флюідамі, то зімой можна ўзяць штосьці больш шчыльнай кансістэнцыі — крэм. Тут правіла такое: зімой пажадана аддаваць перавагу сродку для больш сухой скуры. Калі ў вас камбінаваны тып, то бяром крэм для нармальнага. Калі нармальны, то для сухога. Калі сухі, то для вельмі сухога ці адчувальнага тыпу.

Калі вы карыстаецеся рознымі танальнымі сродкамі, то ў зімовы час гэта яшчэ і догляд. Танальная аснова, пудра — дадатковая ахова. Але ўвечары ўсё гэта абавязкова трэба змыць — міцэлярнай вадой, сродкамі для ачышчэння. І наносіць больш жывільны крэм. Але тут па жаданні — хтосьці на ноч наносіць увільгатняючы, хтосьці жывільны.

Часта даводзіцца чуць меркаванне, што ўвільгатняючыя сродкі зімой лепш не наносіць, бо яны ўтрымліваюць вільгаць і замяр-



заюць на вуліцы. На самай справе ўсе крэмы ўтрымліваюць вільгаць. І сграваюцца за кошт тэмпературы цела — яны не могуць замерзнуць. Але няма нічога страшнага ў тым, калі раніцай вы выкарыстаеце больш тлусты крэм (там абавязкова павінна быць масла Шы, авакада, вітамін Е), а ўвечары ўвільгатняючы. Зімой можна больш інтэнсіўна рабіць увільгатняючыя маскі.

Трэба памятаць, што ўвільгатняючыя сродкі дзеляцца на два віды. Першыя перашкаджаюць выпарванню вільгаці са скуры, яны ўтрымліваюць тлушчы. Другія прыцягваюць вільгаць з навакольнага асяроддзя, гэта дасягаецца за кошт гіялуронавай кіслаты, мачавіны ў іх складзе. Апошнія зімой не актуальныя, бо вільготнасць у памяшканнях зніжаецца, скуры няма адкуль яе прыцягнуць. Таму ў халодны час лепш выбіраць крэмы, якія захоўваюць вільгаць.

**— Улічваючы, што ў памяшканнях не хапае вільгаці, ці ёсць сэнс карыстацца на працягу дня спецыяльнымі ўвільгатняючымі спрэямі?**

— Калі мы раніцай нанеслі той сродак, які ўтрымлівае ўласную вільгаць скуры і не дае ёй выпарвацца, а гэта крэмы на тлушчавай аснове, то такая тэрмальная вада ніякай карысці не прынясе — скура не зможа яе прыцягнуць. Калі мы выкарыстоўваем сродкі, якія ўтрымліваюць гіялуронавую кіслату, мачавіну, гліцэрын, тады тэрмальная вада будзе ўвільгатняць скуру. А вось усё тое, што падтрымлівае вільгаць у памяшканні — увільгатняльнік паветра, праветрыванне, вільготная ўборка — зімой толькі вітаецца.

**— Правільна падабраны рацыён можа дапамагчы скуры не сохнуць?**

— Зімой сапраўды варта ўжываць крыху больш пэўных прадуктаў — сметанковага масла, яек, рыбы тлустых гатункаў, нават сала. Ёсць людзі, у якіх вельмі сухая скура, тады зімой мы рэкамендуем пэўны перыяд прымаць комплекс, які ўтрымлівае вітаміны А і Е. Важна піць больш вадкасці. Складана штосьці раіць вегетарыянцам, у іх скура пакутуе больш за ўсё. Парэкамендаваць можна хіба што арэхі і бабовыя.

**— З якога ўзросту ўжо недастаткова хатняга догляду твару і варта прыбягаць да паслуг прафесіяналаў?**

— Адназначнага адказу тут няма. Цяпер шмат дзяцей і падлеткаў з вугравым сыпам, якім у 10-12 гадоў прыходзіцца ісці да касметолага. Калі мець на ўвазе працэдуры з мэтай падтрымаць скуру і не даць ёй старэць, то пасля 20 адназначна можна пачынаць штосьці рабіць. Калі выконваць простыя працэдуры з маладосці, тады ў больш сталым узросце не спатрэбяцца агрэсіўныя маніпуляцыі. Напрыклад, калі максімальна пастарацца ў 25—35 гадоў, магчыма, пазней і не будзе патрэбы ў гіялуронавых філерах (ін'екцыях шчыльнай гіялуронавай кіслаты, якімі карэктуюць носагубныя складкі, ствараюць аб'ём у скулавой зоне і іншых). Калі ж вы нічога не рабілі, а ў 45 прыйшлі з гравітацыйным птозам (стан, калі пад уздзеяннем сілы прыцягнення скура правісае, а контур і рысы твару дэфармуюцца) і іншымі ўзроставымі праявамі, то біярэвіталізацыяй тут не дапаможаш, варта звяртацца да пластычнага хірурга.

У любым выпадку калі сістэматычна прыбягаць нават да простых працэдур па доглядзе, то на сустрэчы з аднакласнікамі вы будзеце выглядаць лепш, чым тыя, хто гэтага ніколі не рабіў.

**— Якія простыя працэдуры карысныя ў халодны час года?**

— Зімой добра рабіць масажы. Яны паляпшаюць крываток, адлучшваюць клеткі скуры і сілкуюць яе, бо робяцца на спецыяльных крэмах. Прычым лепш менавіта на крэмах, чым на маслах. Таксама зімой карысныя пілінгі. Гэта тое, з чаго трэба пачынаць догляд. Цяпер усё больш пілінгаў, якія можна прымяняць не толькі зімой. Але ў такім выпадку важна прадугледзіць сонцаахову. Дарэчы, яна неабходная ўсім, нават зімой, калі праглядвае сонца. У самыя халодныя месяцы фактар сонцаахоўы (SPF) павінен быць 15—20, а ўжо ў сакавіку — 30. А калі мы едзем у цёплыя краіны, то і 50.

**«Складана штосьці раіць вегетарыянцам, у іх скура пакутуе больш за ўсё. Парэкамендаваць можна хіба што арэхі і бабовыя».**

**— Якія цяпер самыя папулярныя працэдуры па доглядзе?**

— Важна памятаць, што ва ўсіх павінен быць найперш хатні догляд, які адпавядае ўзросту. Калі ў 30, імкнучыся, каб усё было добра, мы бяром лінейку сродкаў 40+, то гэта вялікая памылка. З 25 гадоў у асноўным прыбягаюць да мезатэрапіі, біярэвіталізацыі, батулінатэрапіі. Чым далей, тым больш сур'ёзныя працэдуры. Ваш доктар дапамажа выбудаваць індывідуальную праграму.

Біярэвіталізацыя — гэта ін'екцыйнае ўвядзенне гіялуронавай кіслаты. Пры гэтым тры-чатыры дні ў месцах уколаў захоўваюцца быццам бы дробныя шарыкі, гэта прыкметна. За кошт гіялуронавай кіслаты (а гэта натуральны кампанент скуры) яна насычаецца вільгаццю, становіцца пругкай і эластычнай. Але патрэбны курс — тры-чатыры працэдуры. Мезатэрапія прадугледжвае ўвядзенне гіялуронавай кіслаты і вітамінаў, для істотнага эфекту патрэбна яшчэ больш працэдур. Біярэвіталізацыя і мезатэрапія дазваляюць скуры быць свежай і ззяючай, «ажыўляюць» яе.

Лазернае амаладжэнне (або лазерная шліфоўка) таксама надзвычай эфектыўная працэдура, але тут трэба быць гатовым да больш сур'ёзнага перыяду рэабілітацыі — 7-10 дзён. Верхні слой скуры пашкоджваецца тонкім лазерным промнем, і гэта дае стымул для абнаўлення. Замест старога пашкоджанага слою скуры з'яўляецца новы — малады і здаровы. Першыя два дні ўсё выглядае не вельмі прывабна. Затое пасля твар гладкі і прыгожы.

**«Сёння ў продажы шмат сродкаў, у іх часам складана разабрацца і падабраць без кансультацыі. Але людзі ўсё спрабуюць на сабе і атрымліваюць самыя непрадказальныя эфекты».**

Можна спалучаць працэдуры, гэта ўвогуле дае выдатны вынік. Напрыклад, робіцца біярэвіталізацыя, праз два тыдні — лазерная шліфоўка, а потым зноў біярэвіталізацыя. Лазернае амаладжэнне спалучаюць і з плазмаліфтынгам. Плазмаліфтынг — таксама ін'екцыйная працэдура, калі ўводзіцца ўласная плазма, багатая трамбацытамі. Але гэтыя працэдуры рабіць пажадана ў зімовы час, таму што неабходна сонцаахова.

**— Наколькі бяспечныя гэтыя працэдуры, тая ж батулінатэрапія?**

— Вопыт прымянення ў свеце паказвае, што небяспекі яны не ўяўляюць. Прэпараты (аналагі батулатаксіна) уводзяцца ў мінімальнай дозе, дазваляюць мышцам не скарачацца, за кошт гэтага разгладжваюцца маршчынкі. Найчасцей ён прымяняецца для разгладжвання вертыкальных і гарызантальных маршчын на лбе, «гусіных лапак» (маршчын вакол вачэй), рэдка — у ніжняй трэці твару. Гэта, бадай, самая эфектная працэдура, бо вынік заўважаюць усе.



**— На колькі хапае яе эфекту?**

— Згодна з інструкцыяй, на тры месяцы. Насамрэч, мы прывыкаем не рабіць пэўных мімічных рухаў, і эфект захоўваецца ў сярэднім паўгода.

**— Ці важны кошт касметычных сродкаў? Ці залежыць ад гэтага іх эфектыўнасць?**

— Здараецца так, што касметычны сродак з крамы падыдзе лепш, чым аптэчны. Не дарэмна расіяне набываюць беларускія касметычныя сродкі. Калі я тлумачу пацыентам, як правільна даглядаць скуру, раю пачынаць з магазінных сродкаў. Цэны на аптэчныя могуць быць вышэйшыя ў 10 разоў, а вось эфект?

Адзінае, што догляд скуры патрабуе сістэмнага падыходу, а мы ж чакаем хуткага эфекту. З той жа пігментацыяй вельмі складана змагацца. А людзі чакаюць вынік адразу і кажуць, што сродкі не працуюць. Большасць касметычных прэпаратаў усё ж выконвае сваю функцыю, бо маюць навуковую падаплёку.

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча*

Глуша Адамовіча

# Актывістам быць модна,

## або Што трэба для таго, каб рэалізоўваліся нават самыя дзёрзкія па сваёй смеласці праекты

**Так атрымалася, што справа са стварэннем музея ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна зацягнулася на нявызначаны час. Затое мы сталі сведкамі таго, як за зусім невялікі перыяд адзін звычайны чалавек — не бізнесмен, не чыноўнік, не кіраўнік нейкага прадпрыемства — змог зрабіць для ўвекавечання памяці Алеся Адамовіча так многа.**



Праект па ўстаноўцы бюста Алеся Адамовіча ў Глушы грамадскасць прызнала найлепшым у намінацыі «Партнёрства года».

Мы ўвесь час назіралі (і пісалі), з якім імпэтам і натхненнем бабруйскі хлопец **Андрусь АРХІПЕНКА** займаўся пошукам сродкаў на помнік Алеся Адамовіча ў Глушы, як ён удзельнічаў у краўдфандынгавых кампаніях, слаў лісты ва ўсе канцы свету да вядомых людзей з заклікам падтрымаць праект. Як вынік, за апошнія два гады ў Глушы з'явіўся не толькі бюст пісьменніка, але яшчэ і арт-прыпынак з фотапартрэтам Адамовіча і словамі з яго апошняга твора. Актыўнасць Андрэя паспрыяла таму, што вакол яго ўтварылася цэлая суполка, ініцыятыўная група, якая дапамагла ўсе гэтыя праекты рэалізаваць. Прэцэдэнт у маштабах вобласці даволі рэдкі, асабліва, што датычыцца раёнаў. Нездарма магілёўскі Цэнтр гарадскіх ініцыятыў азначыў Андруся і яго каманду спецыяльнай прэміяй — «Пра рэгіён».

— Мы выбралі праект па Глушы таму, што ён вельмі важны для Магілёўскай вобласці, — адзначыў **кіраўнік** гэтай арганізацыі **Юрый СТУКАЛАЎ**. — Гэта вельмі добры прыклад, калі каманда аднадумцаў, простых людзей можа сваім энтузіязмам ушанаваць памяць такога значнага для нашай гісторыі чалавека. Гэта прэмія ў вобласці грамадскага актывізму наогул уручаецца ўпершыню. Мы яе вырашылі заснаваць Цэнтрам гарадскіх ініцыятыў, каб надаць грамадскаму актывізму больш высокі статус. Каб жыхары горада і вобласці бачылі, што актывістам быць модна, крута. Каб такія прыклады натхнялі іншых і часцей знаходзіліся жадаючыя рабіць лепш не толькі для сябе самога, але і для ўсяго грамадства.

Прынамсі, на ўзроўні раёнаў такога праекта дагэтуль яшчэ не было. З Андрэем мы пазнаёміліся падчас семінара ад нашай школы «Цяпліца» ў Бабруйску два гады таму, і ён адразу ж звярнуў на сябе ўвагу сваёй мэтанакіраванасцю. Мы нават дапамаглі яму адшліфаваць ідэю праекта па арт-аб'екце «Прыпынак Адамовіча».

Яшчэ адна грамадская арганізацыя ўручыла камандзе прэмію ў намінацыі «Партнёрства года». Стварэнне помніка пісьменніку ў Глушы было ацэнена як яскравы прыклад прыватна-дзяржаўнага супрацоўніцтва. Разам з іншымі была адзначана і **былая старшыня Глушанскага сельскага Савета Марыя СУШЧАНКА,** якая дапамагла бабруйскім актывістам рэалізаваць праект. Пад яе кіраўніцтвам праводзілася добраўпарадкаванне тэрыторыі пад устаноўку помніка, высаджваліся туі. Марыя Сушчанка заўсёды з павагай ставілася да славутага земляка і рабіла ўсё для таго, каб і жыхары не забываліся, што іх з Адамовічам звязвае малая радзіма. Менавіта дзякуючы пісьменніку Глуша стала вядомай на ўвесь свет, а гэта, у сваю чаргу, абавязвае трымаць статус. За амаль 13 гадоў знаходжання на пасадзе старшыні яна сем разоў вывodзіла сельсавет у лідары на ўзроўні раёна і па два разы — на абласным і рэспубліканскім узроўнях.

Дзесяць гадоў таму, дзякуючы яе перамозе ў конкурсе міжнародных праектаў, было створана свята вёскі — фестываль творчасці і рамёстваў «Глушанскі хутарок». Гэты фестываль цяпер набыў статус раённага. Пазалетась падчас яго і былі прэзентаваны арт-прыпынак у гонар вядомага земляка. Мы ўжо пісалі, як шмат намаганняў Марыя Сушчанка прыкладала для таго, каб у Глушы з'явіўся музей Алеся Адамовіча. Будынак легендарнай аптэкі — асноўнае месца дзеяння ў творах пісьменніка, захаваўся не без яе старанняў. Гэты дом знаходзіцца побач з сельсаветам і заўсёды быў, як той казаў, пад наглядам. Будынак у цяжкім стане, але ён — жывая гісторыя. І вельмі важна захаваць яго для нашчадкаў. Прыклад супрацоўніцтва Глушанскага сельсавета з прыватнай ініцыятывай на карысць пасёлка яшчэ раз пацвердзіў — разам можна вырашыць нават самыя, здавалася б, неверагодныя задумкі.




Магілёўскі Цэнтр гарадскіх ініцыятыў ацаніў актыўнасць ініцыятыўнай групы па ўвекавечанні памяці Алеся Адамовіча спецыяльнай прэміяй «Пра рэгіён».

— Марыя Сушчанка ўвесь час нас падтрымлівала і натхняла, — кажа Андрусь Архіпенка. — З яе дапамогай было рэалізавана некалькі «адамовіцкіх» праектаў. І распачынаўся яшчэ адзін, які пакуль у рабоце. Летась мы з ініцыятыўнай групай заяўляліся на конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend у спадзяванні выйграць грошы на добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол помніка Адамовічу. Перамагчы не атрымалася, але нас падтрымаў прыватны спонсар, які перадаў на развіццё ідэі тысячу рублёў, і ААТ «Беларусбанк», які прызнаў наш праект найлепшым у рамках Года малой радзімы і пералічыў на яго 10 тысяч рублёў (публікацыя ад 29.05.2019 — **Аўт.**). Мы ўжо набылі сцэну коштам 4200 рублёў для правядзення пасялковых святаў, дзве прыбіральні, а таксама тры паказальнікі і тры стэнды з інфармацыяй пра Адамовіча. Засталося ўсё гэта ўстанавіць на тэрыторыі Глушы.

Сёння абавязкі **старшыні Глушанскага сельскага Савета** выконвае новы не менш вопытны і дасведчаны работнік **Таццяна ПЛОСКАЯ.** І тое, што датычыцца ўшанавання імя Адамовіча, яна лічыць важным і неабходным, бо гэта спрыяе развіццю пасёлка і выхаванню падрастаючага пакалення. «Гэта тая адметнасць, якой можна толькі ганарыцца», — падкрэсліла Таццяна Плоская.

Што датычыцца музея, то збор сродкаў на рэканструкцыю будынка аптэкі пад яго працягваецца. Гэты рахунак існуе пры Бабруйскім райвыканкаме. Нагадаем, самы вялікі ўнёсак — пяць тысяч долараў у эквіваленце — зрабіла нобелеўская лаўрэатка, вучаніца Алеся Адамовіча — Святлана Алексіевіч. Розныя сумы пералічылі працоўныя калектывы, у тым ліку Выдавецкі дом «Звязда», а таксама жыхары краіны. Апошнім часам паступленне сродкаў запаволілася, але ў нашых сілах усё змяніць.

**р/р BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

**Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.**

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Андруся АРХІПЕНКІ.**

Паехалі!

# АПЛАЦІ ПРАЕЗД З МАБІЛЬНІКА

**Адчуць сябе нібыта героем аўтобуснага квэста, дзе заданне знайсці ў салоне «ключ», прайсці этапы і выйсці на новы ўзровень. Інавацыйную тэхналогію продажу электронных білетаў цяпер апрабуюць у Гомелі.**

Новы метад разліку за праезд і кантролю аплаты цяпер можа ажыццяўляцца па QR-коду. Працуе сістэма праз мабільную праграму «Аплаці», якую распрацавала беларуская IT-кампанія на базе плацежнай сістэмы банка. Скарыстацца паслугай могуць уладальнікі банкаўскіх картак і смартфонаў. Пры гэтым, быць утрымальнікам карткі канкрэтнага банка-ўладальніка плацежнай сістэмы не патрабуецца.

Гомель — першы з абласных цэнтраў, дзе аплаціць праезд можна па новай тэхналогіі. Праўда, такая функцыя пакуль даступна толькі на пэўных гарадскіх маршрутах. Аўтобусы звонку і ў салоне пазначаны наклейкамі з назвай мабільнай праграмы «Аплаці».

Ад пасажыра патрабуецца запусціць на тэлефоне праграму, накіраваць экран мабільніка на QR-код, сканіраваць яго. Выява, як ключ да віртуальнай плацежнай сістэмы, аўтаматычна дасць доступ да электроннага кашалька пасажыра. Застанецца толькі ўвесці кошт праезду і аплаціць у адзін клік. Пры гэтым доўга шукаць і прабірацца праз салон да пазначанага месца з QR-кодам не прыйдзецца.

Перавагі новай тэхналогіі тлумачыць **намеснік дырэктара кампаніі-распрацоўшчыка LWO Кірыл ТАЛЕЙКА:**

— Карцінка выдатна распазнаецца на адлегласці да двух метраў. Электронны квіток імгненна адлюстроўваецца на экране смартфона. Тут жа захаваецца нумар білета, транспартнага сродку, прыналежнасць да пэўнага аўтобуснага парка, дата і час пакупкі, а таксама кошт праязнога дакумента.

У далейшым такім шляхам можна будзе набыць і праязныя. Увогуле, мабільная плацежная сістэма разлічана не толькі на продаж, але і на кантроль за электроннымі квіткамі.

— Праверка білета кандуктарам ажыццяўляецца гэтак жа проста, — уводзіць у курс справы **намеснік старшыні праўлення ААТ «Белінвестбанк» Андрэй САКІРКА.** — Пасажыр сканіруе QR-код на бэйджыку кантралёра. Калі аплата прайшла, то на экране мабільніка з'явіцца электронны квіток са статусам «Аплачана». Сэрвіс — абсалютна бясплатны.

Заўважныя плюсы ўжо ацанілі і кандуктары філіяла «Аўтобусны парк № 6» ААТ «Гомельаблаўтатранс». Новай сістэмай абсталяваны пакуль два аўтобусы. Але маршруты, па якіх яны рухаюцца па горадзе, штодня змяняюцца. У бліжэйшы час магчымасць віртуальнай аплаты з'явіцца ва ўсім транспарце філіяла. Гомель — другі горад у Беларусі па колькасці перавозак пасажыраў грамадскім транспартам пасля Мінска.

— Штодня гарадскі транспарт перавозіць каля 280 тысяч чалавек. На лінію выходзіць 210 аўтобусаў. Пры такіх маштабах вельмі важна ўкараненне сучасных тэхналогій аплаты праезду, — падкрэслівае **першы намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Гомельаблаўтатранс» Сяргей МАЦУКОЎ.** — Гэта першы этап замены састарэлай білетнай прадукцыі і пераходу да сучаснага фармату аплатнай сістэмы.




Укараненне такой тэхналогіі дазволіць прадпрыемствам-пасажыраперавозчыкам эканоміць сродкі на ўсталяванне дарагіх валідатараў — электронных прылад для аплаты праезду банкаўскай карткай. Грошы за праезд па новай тэхналогіі электроннага кашалька паступаюць адразу на рахунак перавозчыка.

Людзям, якія не маюць магчымасці карыстацца мабільнай праграмай, перажываць не варта: аплаціць праезд можна традыцыйным спосабам. У тым ліку і наяўнымі грашыма. Дарэчы, разлічыцца ў аўтобусе па новай тэхналогіі пакуль змогуць толькі грамадзяне Беларусі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Буда-Кошелевский комбинат бытового обслуживания» (продавец) в лице ликвидатора Беланова Р. Н. извещает о проведении 17 марта 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 321/С-15646**, площадью **316,9 кв. м,** назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – **комплексно-приемный пункт.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **320555700001000003** общей площадью **0,3418 га** – для размещения объектов административного назначения **(право постоянного пользования).** **Местонахождение:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, Уваровичский с/с, г. п. Уваровичи, ул. Базарная, 23 | **31 000,00** | 3 100,00 |

**Продавец:** ОАО «Буда-Кошелевский комбинат бытового обслуживания», Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 10. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 690-00-10 – Беланов Руслан Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 февраля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 13 марта 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **3 (три) дня** до его проведения. **Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с постановлением Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

